Установа адукацыі “Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна”

Філалагічны факультэт

Кафедра беларускага літаратуразнаўства

**А.С. Кавалюк**

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ XX – пачатку XXI стагоддзя

Вучэбна-метадычны дапаможнік
для студэнтаў гуманітарных і педагагічных спецыяльнасцей
філалагічнага факультэта

У трох частках

Частка 3

Брэст
БрДУ імя А.С. Пушкіна
2015

УДК82(476)(091)(075.8)
ББК 83 (4Беи)
К 12

*Рэкамендавана рэдакцыйна-выдавецкім саветам
установы адукацыі "Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт
імя А. С. Пушкіна"*

*Рэцэнзенты:*
кандыдат філалагічных навук, загадчык кафедры журналістыкі УА "Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна" **Скібіцкая Л.В.**
кандыдат філалагічных навук, загадчык кафедры беларускай і рускай моў
УА "Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт" **Борсук Н.М.**

**Кавалюк, А.С.**
К12 Гісторыя беларускай літаратуры ХХ – пачатку ХХІ стагоддзя : вучэбна-метадычны дапаможнік для студэнтаў гуманітарных і педагагічных спецыяльнасцей філалагічнага факультэта / А.С. Кавалюк ; Брэсц. дзярж. ун-т імя А.С. Пушкіна, філал. фак., каф. бел. літ-зн-ва. – Брэст : Выд-ва БрДУ, 2014. – 78 с.

Вучэбна-метадычны дапаможнік уключае план-праспект аглядавых і манаграфічных лекцыйных тэм па курсу, падрабязную распрацоўку практычных заняткаў з выхадам на школьную праграму, пытанні да экзамена, спіс твораў для чытання. Прапанавана асноўная і дадатковая літаратура па тэмах.

Выданне адрасавана студэнтам гуманітарных і педагагічных спецыяльнасцей філалагічнага факультэта.

Кавалюк А.С., 2015
Выдавецтва УА "БрДУ
імя А.С. Пушкіна", 2015

# ЗМЕСТ

**Прадмова**………………........................................................................... 4
**План-праспект курса** ………………………………………………………… 5
Творчасць Анатоля Кудраўца ………………………………………….... 5
Творчасць Віктара Карамазава …………………………………….……….. 7
Вясковая, маральна-этычная і экалагічная праблематыка ў прозе другой паловы XX – пачатку XXI ст. . ……………………………..……… 9
Сучасная літаратура Беларусі (другая палова 80-х – пачатак XXI ст.) ….. 18
Сучасная беларуская проза …………………………………………….... 21
Сучасная гістарычная проза …………………….................................. ...26
Сучасная беларуская паэзія ……………………………………………... 35
Творчасць Рыгора Барадуліна ……………………………………........ 38
Творчасць Ніла Гілевіча …………………………………………………… 43
Сучасная беларуская драматургія ………………………………………… .49
Літаратура Берасцейшчыны ……………………………………………... 56
Літаратура беларускага замежжа………………………………………… 65
**Спіс рэкамендуемых для чытання твораў** ..…..……………………… 74
**Прыкладныя пытанні да экзамену**......................................................... 77

# ПРАДМОВА

Вучэбна-метадычны дапаможнік “Гісторыя беларускай літаратуры ХХ – пачатку ХХІ стагоддзя” з’яўляецца працягам дапаможніка “Гісторыя беларускай літаратуры другой паловы ХХ стагоддзя”, які быў выдадзены ў дзвюх частках, і завяршае агляд літаратуры ХХ – пачатку ХХІ стагоддзя. Ён будзе садзейнічаць якаснай навукова-тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўцы студэнтаў-філолагаў у адпаведнасці з патрабаваннямі дзяржаўнага адукацыйнага стандарта. Выданне адрасавана студэнтам спецыяльнасцей: 1-21 05 01-01 “Беларуская філалогія (літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць)”, 1-02 03 01 “Беларуская мова і літаратура”, 1-02 03 03-02 “Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская)”, 1-21 05 02 “Руская філалогія”, 1-02 03 02 “Руская мова і літаратура”.

Дапаможнік уключае план-праспект аглядавых і манаграфічных лекцыйных тэм па курсу, падрабязную распрацоўку практычных заняткаў з выхадам на школьную праграму, асноўную і дадатковую літаратуру па тэмах, прыкладныя пытанні да экзамена, спіс рэкамендуемых для чытання твораў.

План-праспект аглядавых і манаграфічных тэм дапаможа студэнтам узнавіць лекцыйны матэрыял, што з’яўляецца абавязковай умовай пры падрыхтоўцы да практычных заняткаў, залікаў і экзаменаў. Асабліва карысным план-праспект будзе для самападрыхтоўкі па тэмах, якія не чытаюцца лекцыйна, а па іх праводзяцца практычныя заняткі.

Пры распрацоўцы пытанняў практычных заняткаў акцэнт зроблены на пераемнасць “ВНУ – школа”. Творы, якія вывучаюцца ў школе, павінны быць прачытаны і прааналізаваны да заняткаў з асаблівай засяроджанасцю. Пад умоўнай назвай “Штрыхі да партрэта пісьменніка” прапануецца падабраць фрагменты з успамінаў, аўтабіяграфіі, іншых крыніц, у выніку чаго ў будучых настаўнікаў збяруцца матэрыялы для цікавага і запамінальнага знаёмства вучняў з асобай пісьменніка. У “вершаваным калейдаскопе” чытаюцца вершы паэта, што найбольш уразілі.

Абавязковай умовай паспяховага авалодання зместам курса з’яўляецца чытанне мастацкіх твораў. На апошніх старонках выдання змешчаны спісы рэкамендуемых для чытання твораў. Асноўная і дадатковая літаратура, што падаецца да кожнай тэмы, можа быць выкарыстана не толькі пры падрыхтоўцы да практычных заняткаў і экзаменаў, але і пры напісанні рэфератаў, курсавых, дыпломных і магістарскіх прац.

Выкананне гэтых парад дазволіць студэнтам не толькі паспяхова падрыхтавацца да практычных заняткаў, залікаў і экзаменаў, але і зрабіць упэўнены крок да авалодання зместам усяго курса.

# ПЛАН-ПРАСПЕКТ КУРСА

## ТВОРЧАСЦЬ АНАТОЛЯ КУДРАЎЦА (нар. у 1936 г.)

Звесткі з біяграфіі. Прыход у літаратуру. Раннія апавяданні, мініяцюры. Кніга прозы "На зялёнай дарозе" (1968). Малюнкі беларускай вёскі. Вобраз жанчыны-сялянкі. Прыхільнасць А. Кудраўца да вясковай тэмы. Добрае веданне пісьменнікам паўсядзённага побыту, нораваў, звычаяў, псіхалогіі вяскоўцаў. Малюнкі беларускай вёскі ў апавяданнях "Гарачыня", "Прэмія", "Стары настаўнік", "Яйкі", "Сяструха", "Іваніха", "Марута і Зіна", "Мама чакае". Вобраз беларускай жанчыны-сялянкі. Сцвярджэнне агульначалавечай маралі і выпрабаванне герояў на духоўную сталасць у апавяданнях "Другі варыянт", "Мікола вярнуўся", "Бацька і сын", "Гэлька", інш. Умацаванне эпічнай і псіхалагічнай тэндэнцыі ў прозе А. Кудраўца. Падтэкстава-псіхалагічны метад раскрыцця чалавечых характараў – найбольш блізкі і сугучны ўнутранай прыродзе яго пісьменніцкага таленту.

Аповесць "Раданіца" (1971) – "даніна ўдзячнай сыноўскай памяці пра бацьку і светлая адзнака глыбокай любові да маці" (В. Жураўлёў). Біяграфічная аснова твора. Вобразы Івана Купцова і Лёксы. Маральна-этычнае асэнсаванне тэмы вёскі і горада. Праблема пераемнасці пакаленняў, матыў сувязі чалавека са светам людства. Увасабленне ў творы канфлікту паміж высокай духоўнасцю, глыбокай народнай памяццю і агрэсіўным бяспамяцтвам-манкурцтвам. Выяўленне нязменнай ролі народнага вопыту, народных традыцый у духоўным жыцці чалавека.

Працяг тэндэнцыі выпрабавання чалавека на духоўную сталасць у зборніках апавяданняў "Дзень перад святам" (1975), "Зімы і вёсны" (1976), "На балоце скрыпелі драчы" (1979). Уменне аўтара пераключыць побытавую плынь гаворкі ў план маральна-філасофскага роздуму аб духоўным выхаванні чалавека.

Кніга зарубежных падарожных нарысаў "За чужымі далямі" (1981).

Апавяданне "Ігнат Сцяпанавіч Вапшчэткі" (1979) як злучальнае звяно з жанрам рамана ў творчасці А. Кудраўца. Адметнасць кампазіцыйнай будовы, пластычнасць малюнкаў, новы паварот мастацкай думкі, скіраванай на эпічнае выяўленне індывідуальна-тыпалагічнай сутнасці народнага характару ў апавяданні.

Раман "Сачыненне на вольную тэму" ("Пасеяць жыта") (1984). Аналітычна-філасофскі падыход да жыцця ў творы. Глыбока народны характар Ігната Вапшчэткі, чалавека невычарпальных духоўна-псіхалагічных рэсурсаў. Ёмістасць сістэмы маральных каштоўнасцей, сцверджаных у творы. Пытанні гуманізму ў сюжэтнай канве рамана. Вобраз хутаранца Стася Мастоўскага ў аўтарскім вырашэнні праблемы прымусовай калектывізацыі. Праблемы

жыццёвага выбару, бацькоў і дзяцей і інш. у мастацкай інтэрпрэтацыі А. Кудраўца. Пазнавальна-адлюстравальная функцыя мастацкага прыёму ўспаміну ў творы. Успамін як дамінуючая прыкмета кампазіцыйнай будовы. Моўна-стылявыя асаблівасці рамана (пазнавальна-адлюстравальная і павучальна-метадалагічная функцыі мастацкага слова, афарыстычна-прытчавая моўная манера галоўнага героя, інш.).

Неардынарныя захады пісьменніка да вытлумачэння маральна-этычных пытанняў у аповесцях “Пахахуцікі”, “Двое за нізкім столікам”, “Смерць нацыяналіста”, інш. Зварот А. Кудраўца да неадназначных, супярэчлівых фактаў і сітуацый ваеннага і пасляваеннага жыцця ў апавяданнях “Познія яблыкі” (1996), “Бацька” (1999), “Зязюля пракукуе заўтра…” (2001). Майстэрства празаіка. Сканцэнтраванасць пісьменніцкага позірку на выяўленні неадпаведнасці паміж адвечнай духоўнай сутнасцю чалавека і тым, што робіць з чалавекам жыццё. Арыентацыя мастака на новым этапе творчасці на выверанныя шматвекавой народнай практыкай маральныя і эстэтычныя крэтэрыі, сцвярджэнне самакаштонасці чалавека, яго ўнікальнасці і бескампраміснае асуджэнне ігнаравання адвечных маральных норм.

А. Кудравец – аўтар сцэнарыя тэлефільма “Восеньскія яблыкі” (1975, паст. 1977). Экранізацыя на кінастудыі “Беларусьфільм” аповесці “Радаціца” (сцэнарый разам з Ф. Коневым), апавядання “Халады ў пачатку зімы”.

Перакладчыцкая дзейнасць А. Кудраўца. Пераклады яго твораў на многія мовы.

***У школьную праграму ўведзена*** апавяданне А. Кудраўца “Цітаўкі” (5 кл.).

## Крыніцы

1. Кудравец, А. Радаціца / А. Кудравец // Выбраныя творы : у 2 т. Т. 1 : Аповесць. Апавяданні / А. Кудравец ; прадм. С. Андраюка. – Мінск : Маст. літ., 1987. – С. 13–106.

2. Кудравец, А. Пасеяць жыта / А. Кудравец // Выбраныя творы : у 2 т. Т. 2 : Раман. Замежныя эцюды / А. Кудравец. – Мінск : Маст. літ., 1987. – С. 5–241.

## Асноўная літаратура

1. Андраюк, С. На зялёнай дарозе жыцця / С. Андраюк // Выбраныя творы : у 2 т. Т. 1 : Аповесць. Апавяданні / А. Кудравец ; прадм. С. Андраюка. – Мінск : Маст. літ., 1987. – С. 5–12.

2. Жураўлёў, В.П. Анатоль Кудравец / В.П. Жураўлёў // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. Т. 4. Кн. 1. 1966–1985 / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы ; навук. рэд. У. Гніламёдаў, С. Лаўшук. – Мінск : Бел. навука, 2002. – С. 645–674.

3. Кудравец Анатоль // Беларускія пісьменнікі : Біябібліягр. слоўн. : у 6 т. / Ін-т літ. імя Я. Купалы ; рэдкал.: І. Багдановіч [і інш.]. – Мінск : “Беларус. энцыкл.”, 1992–1995. – Т. 3 : Івашын – Кучар. – 1994. – С. 437–440.

**Дадатковая літаратура**

1. Стральцова, В. “Радасць ад таго, што жыву” / В. Стральцова // Роднае слова. – 2005. – № 12. – С. 3–5 [тэма сэнсу жыцця ў творах А. Кудраўца].

## **ТВОРЧАСЦЬ ВІКТАРА КАРАМАЗАВА** (нар. 1934 г.)

Звесткі з біяграфіі. Праца ў журналістыцы і прыход у літаратуру. Зборнік апавяданняў “Падранак” (1968). Вечныя праблемы чалавечага жыцця, нацыянальны тып маладой жанчыны ў аповесці “Пагоннік” (1967). Увасабленне тэмы жыцця і клопатаў вясковага чалавека. Праблема неперспектыўных вёсак і адзінокай старасці, міграцыі вясковага насельніцтва і вяртання да вытокаў. Увага пісьменніка да ўнутранага свету герояў. Суадносіны духоўнага свету герояў з прыгажосцю навакольнага свету. Маральна-этычная праблематыка апавяданняў “Дзяльба кабанчыка”, “Сямёнаўна”, інш. Філасофскі змест аповесці “Бярозавыя венікі” (1973). Вобразы Арсена, Генкі, Сцяпана, Герасіма, Лукіча ў мастацкай канве твора.

Філасофія чалавека і прыроды ў рамане “Пушча” (1979). Прырода – “лепшы прафесар. І хто пройдзе навуку ў гэтага прафесара, той – сапраўдны чалавек” (В. Карамазаў). Сімвалічна-абагульнены вобраз-матыў Пушчы як “храма, сабора, дзе правіцца культ чысціні, аднолькава значны і для чалавека, і для яго меншых суседзяў па Пушчы” (П. Васючэнка). Пастаноўка і вырашэнне аўтарам вострых пытанняў чалавечага жыцця, яго мінулага і будучага, складаных узаемаадносін з прыродай. Пошукі героямі жыццёвай устойлівасці, духоўных каштоўнасцей. Воразы ляснічага Валошкі, лесніка Макара, Курнопы, дзеда Гароха. Асуджэнне спажывецтва, прагматызму і амаральнасці праз вобразы дырэктара лясгаса Зімаўца, лесніка Рысева і інш. Сімвалічны вобраз ваўка.

Тэма адданасці роднай зямлі, вернасці нацыянальным вытокам ў аповесцях “Дзень Барыса і Глеба” (1980) і “Дома” (1984). Мастацкія асаблівасці і сістэма вобразаў твораў.

Раман “Бежанцы” (1990) як мастацкае ўвасабленне драмы маленькага чалавека ў варунках гісторыі. Матыў бежанства як сімвалічнае асэнсаванне лёсу Бацькаўшчыны. Спалучэнне ў творы двух часавых пластоў – Вялікай Айчыннай вайны і постчарнобыльскай сучаснасці. Вобразы Васіля Падабеда, яго дзеда Трахіма, бацькі Захара і сына Сярожы. Вобразы детдомаўцаў Рамана і Лёхі.

Гісторыка-філасофскія праблемы лёсу беларускага народа і нацыі ў аповесці “Краем белага шляху” (1994). Праблема трагізму асобы ў

бюракратычнай дзяржаве. Увасабленне аўтарскай канцэпцыі ў вобразна-метафарычнай сістэме аповесці-трагедыі “Цэзары і Зона”. Вобраз доктара Валетава. Праблема духоўнага “чарнобыля” ў творы. Матывы апакаліпсісу і Аброчнага крыжа. Сэнсавае напаўненне вобраза Будавея на Салаўках. Алегарызм і містыка ў заключных сцэнах аповесці.

Тэмы Чарнобыля і Афганістана ў апавяданнях “Супраць неба – на зямлі”, “Жанчына ў чорным і Афган”. Глыбокі псіхалагізм – асаблівасць творчай манеры пісьменніка.

Мастацкае асэнсаванне лёсу жывапісца Бялыніцкага-Бірулі ў аповесці-эсэ “Крыж на зямлі і поўня ў небе” (1991). Зварот пісьменніка да дакументальнага матэрыялу, дзённікаў, эпісталярыю мастака. Матыў творчых пакутаў і болю асобнага чалавека як адзін са шляхоў спасціжэння свету. Адлюстраванне драматызму лёсу мастака ў савецкі перыяд. Жыццё і творчасць мастакоў С. Жукоўскага, Г. Вашчанкі, А. Бараноўскага, А. Бархаткова ў аповесцях і эсэ кнігі “З вясною ў адным вагоне” (2002). Мастацка-біяграфічная апвесць пра беларускага мастака Г. Вашчанку “Брама” (2006). Кніга публіцыстычнай прозы і эсэ “Проста ўспомніў я цябе…” (1989, Дзяржаўная прэмія Беларусі імя К. Каліноўскага, 1990).

***У школьную праграму ўведзены наступныя творы В. Карамазава:*** апавяданне “Дзяльба кабанчыка” (7 кл.); раманы “Пушча”, “Бежанцы”, “Крыж на зямлі і поўня ў небе”, аповесць “Бярозавыя венікі” (11 кл.).

**Крыніцы**

1. Карамазаў, В. Аброчны крыж : Аповесці, апавяданні / В. Карамазаў. – Мінск : Маст. літ., 1994. – 382 с.

2. Карамазаў, В. Бежанцы: Раман / В. Карамазаў. – Мінск : Маст. літ., 1993. – 287 с.

3. Карамазаў, В. Брама : аповесць / В. Карамазаў. – Мінск : Кнігазбор, 2006. – 128 с.

4. Карамазаў, В. Выбраныя творы : у 2-х т. Т. 1. Бежанцы : раман ; Краем белага шляху ; Дзень Барыса і Глеба : аповесці / В. Карамазаў ; прадм. П. Васючэнкі. – Мінск : Маст. літ., 1997. – 509 с.

5. Карамазаў, В. Галуба : Раман, аповесць, апавяданні : для ст. шк. узросту / В. Карамазаў ; маст.У. Ісачанка. – Мінск : Юнацтва, 1996. – 590 с.

6. Карамазаў, В. Дзяльба кабанчыка : Выбранае / В. Карамазаў ; прадм. М. Стральцова. – Мінск : Маст. літ., 1988. – 560 с.

7. Карамазаў, В. З вясною ў адным вагоне : Аповесці, эсэ, дзённік : для сярэд. і ст. шк. узросту / В. Карамазаў ; маст. А. Званароў. – Мінск : Юнацтва, 2002. – 399 с.

**Асноўная літаратура**

1. Віктар Карамазаў / П. Васючэнка, А. Сямёнава, А. Пісьмянкоў і інш. // Крыніца. – 1997. – № 10–11. – С. 2–37 [матэрыялы пра жыццё і творчасць пісьменніка].

2. Карамазаў Віктар // Беларускія пісьменнікі : Біябібліягр. слоўн. : у 6 т. / Ін-т літ. імя Я. Купалы ; рэдкал.: І. Багдановіч [і інш.]. – Мінск : "Беларус. энцыкл.", 1992–1995. – Т. 3: Івашын – Кучар. – 1994. – С. 156–158.

3. Яскевіч, А. Віктар Карамазаў / А. Яскевіч // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – 2-е выд. – Мінск : Беларус. навука, 2001–2002. – Т. 4. Кн. 1. – 2002. – С. 571–593.

**Дадатковая літаратура**

1. Дудзінская, Дз. Залежнасць свету ад душэўнага зместу героя / Дз. Дудзінская. – Роднае слова. – 2002. – № 12. – С. 35–39.

2. Локун В. Кругі жыцця / В. Локун // Локун В. Кругі жыцця – кругі літаратуры. – Мінск, 2002. – С. 218–227.

3. Яскевіч, А. Надзённае ў вечным : Творчы партрэт В. Карамазава / А. Яскевіч // Полымя. – 2001. – № 2. – С. 272–296.

## ВЯСКОВАЯ, МАРАЛЬНА-ЭТЫЧНАЯ І ЭКАЛАГІЧНАЯ ПРАБЛЕМАТЫКА Ў ПРОЗЕ другой паловы XX – пачатку XXI ст.

*Вясковая, маральна-этычная праблематыка* – традыцыйная для беларускай літаратуры. Творы Я. Коласа, К. Чорнага, І. Мележа як мастацкае асэнсаванне месца чалавека на зямлі і ў сусвеце. Актуальнасць праблематыкі ў сучасным жыцці. Плённы працяг традыцый нацыянальнай прозы пісьменнікамі-"шасцідзесятнікамі" (А. Кудравец, І. Пташнікаў, В. Карамазаў, інш.).

Вясковая тэма ў творчасці І. Пташнікава. Раман "Мсціжы" (1972) як адзін з лепшых твораў беларускай вясковай прозы 60–70-х гадоў. Псіхалагічны канфлікт твора. Супярэчлівасць вобраза галоўнага героя. Адносіны Андрэя Вялічкі да людзей, прыроды, непрыманне ім прыстасавальніцтва, спажывецтва, бездухоўнасці. Матыў роднага карэння ў творы. Шырокае адлюстраванне народнага жыцця, хараства прыроды, лёсу простага чалавека ў рамане І. Пташнікава "Алімпіяда" (1985). Вобраз жанчыны-маці, самаадданай працаўніцы, творцы жыцця. Увасабленне ў характары Алімпіяды лёсу народа, яго лепшых нацыянальных рыс. Прадстаўнікі маладога пакалення, пошукі імі свайго месца ў жыцці. Маральна-этычная праблематыка твора. Новыя аспекты асэнсавання вясковай тэматыкі ў апавяданні І. Пташнікава "Тры пуды жыта" (1998).

Зварот да вясковай тэматыкі А. Жука. Паказ вяскоўцаў у аповесці "Халодная птушка" (1977). Цягавітасць, сялянская прыцярпеласць Анэты да

неўладкаванасці, цяжкасцей вясковага жыцця, шматлікіх жыццёвых бед. Трагедыя старасці жанчыны.

Паказ вёскі і вяскоўцаў у творах Б. Сачанкі, В. Адамчыка, І. Чыгрынава, А. Кудраўца, В. Карамазава.

Працяг традыцый беларускай вясковай прозы пісьменнікамі малодшага пакалення (А. Федарэнка, А. Казлоў, Х. Лялько). Мастакоўская і чалавечая пазіцыя А. Федарэнкі: "вёска – гэта нешта адзіна сапраўднае, нейкі светлы разумны куточак у свеце вар'яцтва… вёска ўратуе свет, а не нешта іншае". Два тыпы герояў у творах пісьменніка: пажылыя людзі, носьбіты традыцыйных каштоўнасцей ("Сыч", "Вёска", "Такое кароткае лета"); маладыя людзі пераважна вясковага паходжання, якія шукаюць сэнс жыцця, шляхі самарэалізацыі ("Гісторыя хваробы", "Вёска", "Рэвізія").

*Дзве тэндэнцыі асэнсавання экалагічнай праблематыкі ў нацыянальнай прозе:* 1) паказ гарманічнага суіснавання чалавека і прыроды; 2) паказ страты гэтай гармоніі, паглыблення экалагічнага крызісу. Выяўленне першай тэндэнцыі ў аповесцях В. Казько "Цвіце на Палессі груша", Я. Пархуты "Адзінец"; другой – у раманах В. Карамазава "Пушча", В. Казько "Неруш", аповесці А. Наварыча "Забівец", Б. Сачанкі "Ваўчыца з Чортавай Ямы", інш.

Роля аповесці Я. Пархуты "Адзінец" (1990) ў асэнсаванні нацыянальнай прозай экалагічнай праблематыкі. Выяўленне гарманічнага суіснавання чалавека і прыроды праз вобраз "палескага рабінзона" Івана Бушылы.

"Экалагічны" перыяд творчасці В. Казько. Роля аповесці "Цвіце на Палессі груша" (1978) ў разуменні пісьменніцкай канцэпцыі "нерушы", некранутасці, запаветнасці. Гармонія чалавека і прыроды, паяднанне іх агульнымі біярытмамі. Асэнсаванне праблем меліярацыі ў рамане "Неруш" (1981). Вобразы Мацея Роўбы і Шахрая як розныя тыпы "пакарыцеляў" прыроды. Ідэя твора і сэнс яго назвы. Роля фальклорна-міфалагічных вобразаў Галоскі-Галасніцы і Жалезнага Чалавека ў вырашэнні аўтарскай задумы. Тыпалагічныя паралелі рамана з творамі іншых літаратур. Элементы новага светаадчування (прадчування глабальнай катастрофы) ў "Нерушы". Біблейскія матывы ў творы. Паказ дэградацыі беларускай савецкай вёскі, асэнсаванне яе прычын ў аповесці В. Казько "Выратуй і памілуй нас, чорны бусел" (1989). Вяртанне да духоўных арыенціраў як шлях да разумнага жыцця ў сусвеце.

Чалавек і прырода ў аповесці А. Жука "Паляванне на Апошняга Жураўля" (1982). Самаахвярнасць Сцяпана Дзямідчыка ў барацьбе за захаванне прыродных багаццяў, хараства навакольнага свету. Асуджэнне хцівасці, браканьерства наменклатурных чыноўнікаў. Роля фальклорна-казачных, сімвалічных вобразаў Апошняга Жураўля і Старога Бабра ў мастацкім асэнсаванні праблемы родных каранёў.

Чарнобыльская трагедыя як паглыбленне экалагічнага крызісу на Беларусі. *Чарнобыльская тэма ў асэнсаванні нацыянальнай літаратуры.*

Першыя паэтычныя водгукі на падзеі. Чарнобыльская тэма ў творчасці пісьменнікаў, радзіма якіх аказалася ў забруджанай зоне (М. Мятліцкі, Б. Сачанка, інш.).

Аповесці Б. Сачанкі "Еўка" (1986) і "Родны кут" (1987) – першыя празаічныя творы на чарнобыльскую тэму ў беларускай літаратуры.

Паказ фізічнага ўздзеяння радыяцыі на ўсё жывое ў апавяданні "Львы" (1988) І. Пташнікава. Майстэрства падключэння «жывёльнай свядомасці" для вырашэння аўтарскай задумы.

Раман "Злая зорка" (1991) І. Шамякіна – першы буйнажанравы твор чарнобыльскай тэматыкі. Выяўленне ў рамане "чарнобыля" фізічнага і маральнага. Пісьменніцкі ідэал кіраўніка ў вобразе Уладзіміра Пыльчанкі. Асабістая драма героя. Вобраз Лізы Пустаход у паказе драматычнага лёсу чарнобыльскіх перасяленцаў. Спалучэнне ў "Злой зорцы" тэм Чарнобыля і Афганістана – дзвюх страшных трагедый у лёсе Беларусі, іх мастацкае вырашэнне праз вобразы Барыса і Глеба. Хрысціянскія матывы ў творы, сімвалічны сэнс яго назвы. Вобразы-сімвалы. Працяг асэнсавання трагічных падзей Чарнобыля і Афганістана ў аповесці І. Шамякіна "Зона павышанай радыяцыі" (1997), апавяданні В. Карамазава "Супраць неба – на зямлі" (1989).

Мастацкі сплаў містыфікацыі, фантасмагорыі, абсурду і гратэску ў аповесці В. Казько "Выратуй і памілуй нас, чорны бусел". Выяўленне маральнага "чарнобыля" ў творы. Праблема духоўнага "чарнобыля" ў аповесцях В. Карамазава "Краем белага шляху" (1994) і В. Быкава "Ваўчыная яма" (1998).

Дакументальна-мастацкая кніга С. Алексіевіч "Чарнобыльская малітва" (1986–2005).

## ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ

## **Вясковая, маральна-этычная і экалагічная праблематыка ў прозе другой паловы XX – пачатку XXI ст.**

1. Назавіце пісьменнікаў, якія распрацоўвалі вясковую тэму ў беларускай літаратуры другой паловы XX ст. Традыцыі якіх пісьменнікаў-класікаў яны працягвалі?
2. Чаму вясковая тэма заняла вядучае месца ў беларускай літаратуры і ў творчасці пісьменнікаў-"шасцідзесятнікаў"?
3. Раскажыце пра распрацоўку тэмы вёскі І. Пташнікавым.

3.1 Акрэсліце псіхалагічны канфлікт рамана "Мсціжы". Ахарактарызуйце вобраз галоўнага героя праз яго адносіны да сям'і, людзей і прыроды. Паразважайце пра супярэчлівасць вобраза Андрэя Вялічкі. Раскажыце пра свет прыроды, створаны І. Пташнікавым у рамане. Як у "Мсціжах" адлюстраваны і

асуджаюцца спажывецкія адносіны да прыроды? Раскрыйце ролю вобраза-сімвала карэння ў выяўленні ідэі твора.

3.2 Што дае падставы даследчыкам назваць вяршыняй творчасці І. Пташнікава раман “Алімпіяда”? Якім чынам пісьменніку ўдалося спалучыць у творы дзве вядучыя для літаратуры другой паловы ХХ ст. тэмы – вясковую і ваенную? Раскрыйце вобраз галоўнай гераіні, выявіце адносіны да Алімпіяды Падаляк аўтара. Чым гэты вобраз быў асабліва блізкі і дарагі І. Пташнікаву? Як увасобіў пісьменнік у асобе галоўнай гераіні лёс народа і лепшыя рысы нацыянальнага характару? Якія аспекты вясковага жыцця і маральна-этычныя праблемы трапілі ў поле зроку І. Пташнікава? Як у рамане паказана маладое пакаленне?

3.3 Якія новыя аспекты асэнсавання вясковай тэматыкі выявіліся ў апавяданні І. Пташнікава “Тры пуды жыта”?

4. У якіх творах А. Кудраўца раскрываецца вясковая тэма?

4.1 Якім чынам удалося пісьменніку ў аповесці “Раданіца” ўвасобіць канфлікт паміж высокай духоўнасцю, глыбокай народнай памяццю і агрэсіўным бяспамяцтвам-манкуртцвам? Як вырашаецца ў творы праблема пераемнасці пакаленняў? Раскрыйце вобразы Івана Купцова, яго маці Лёксы.

4.2 Паразважайце пра глыбока народны характар Ігната Вапшчэткі ў рамане “Сачыненне на вольную тэму” (“Пасеяць жыта”). Акрэсліце праблемна-тэматычнае поле твора. Якое мастацкае вырашэнне ў ім знайшлі праблемы жыццёвага выбару, бацькоў і дзяцей і інш.? Вызначце мастацкую функцыю ў рамане прыёма ўспаміну. Назавіце моўна-стылявыя асаблівасці твора. Паразважайце над назвамі рамана. Якая з іх, на вашу думку, больш раскрывае ідэйна-філасофскі змест твора?

4.3 Якія маральна-этычныя праблемы будзеце асэнсоўваць з вучнямі 5 класа пры вывучэнні апавядання А. Кудраўца “Цітаўкі”?

5. Вызначце месца твораў пра вёску ў творчасці В. Карамазава. Назавіце апавяданні пісьменніка вясковай тэматыкі.

5.1 Як вырашаецца праблема страты духоўных каштоўнасцей у аблегчаным цывілізацыяй жыцці ў аповесці “Бярозавыя венікі”? Ахарактарызуйце вобразную сістэму твора. Пракаменціруйце сімвалічнасць фінальнай сцэны. На якіх праблемах аповесці, на вашу думку, неабходна засяродзіць асаблівую ўвагу пры яе аналізе з вучнямі 11 класа?

5.2 Акрэсліце праблематыку аповесці “Дзень Барыса і Глеба”. Дайце характарыстыку вобразам Мазепы, Цімы-Князя, Ромкі. Якія вобразы ў творы супрацьстаяць ім? Вызначце асаблівасці кампазіцыі аповесці. Паразважайце пра сімвалічны змест назвы твора.

5.3 На якіх маральна-этычных праблемах і мастацкіх асаблівасцях твора будзеце засяроджваць увагу вучняў пры вывучэнні апавядання В. Карамазава “Дзяльба кабанчыка” ў 7 класе?

6. Раскажыце пра працяг традыцый беларускай вясковай прозы пісьменнікамі малодшага пакалення.

6.1 Акрэсліце месца вясковай тэмы ў творчасці А. Федарэнкі. Прааналізуйце, якія два тыпы герояў стварае пісьменнік у сваіх творах (“Сыч”, “Такое кароткае лета”, “Гісторыя хваробы”, “Вёска”, “Рэвізія”).

6.2 На якім матэрыяле з жыцця беларускай вёскі засяроджваецца А. Казлоў у аповесці “Незламаная свечка”? Вызначце ідэю твора, раскрыйце сэнс яго назвы. Ці будзе цікавай, на вашу думку, гэтая аповесць вучням пры вывучэнні сучаснай літаратуры ў 11 класе?

6.3 На што будзеце звяртаць ўвагу, аналізуючы з пяцікласнікамі апавяданне Х. Лялько “Касцы”?

7. Вызначце месца экалагічнай праблематыкі ў беларускай прозе другой паловы ХХ – пачатку ХХІ ст. Назавіце пісьменнікаў, якія далучыліся да яе распрацоўкі.

8. Раскажыце, як ад ваеннай да вясковай тэматыкі перайшоў В. Казько. Што дало падставы даследчыкам гэты перыяд яго творчасці назваць “экалагічным”?

8.1 Якія аспекты ўзаемаадносін чалавека і прыроды асэнсоўваліся пісьменнікам у аповесці “Цвіце на Палессі груша”? Вызначце ролю твора ў разуменні пісьменніцкай канцэпцыі “нерушы”.

8.2 Якія праблемы экалогіі трапілі ў поле зроку В. Казько ў рамане “Неруш”? На якой падставе пісьменнік параўноўвае Палессе з раем? Ахарактарызуйце вобразы Мацея Роўбы і Шахрая як розныя тыпы “пакарыцеляў” прыроды. Вызначце ідэю твора і растлумачце сэнс яго назвы. Акрэсліце ролю фальклорна-міфалагічных вобразаў Галоскі-Галасніцы і Жалезнага Чалавека ў вырашэнні аўтарскай задумы. З якімі творамі іншых літаратур можаце правесці тыпалагічныя паралелі рамана? Што дало падставы даследчыкам творчасці В. Казько гаварыць аб элементах новага светаадчування ў “Нерушы”? Што гэта за светаадчуванне? Вызначце біблейскія матывы ў творы.

9. Чым сярод іншых твораў вясковай і экалагічнай тэматыкі вылучаецца аповесць А. Жука “Паляванне на Апошняга Жураўля”? Раскрыйце вобраз галоўнага героя праз яго адносіны да людзей, да прыроды, да працы. Ці можна і чаму Сцяпана Дзямідчыка назваць Апошнім Жураўлём? Вызначце асаблівасці кампазіцыі твора і ролю сімвалічных вобразаў Апошняга Жураўля і Старога Бабра ў вырашэнні аўтарскай задумы. Якія мастацкія магчымасці адкрыла пісьменніку падключэнне ў творы т.зв. “жывёльнай свядомасці”?

10. Вызначце тэму і ідэю рамана В. Карамазава “Пушча”. Што дало падставы даследчыкам адным з галоўных герояў твора назваць пушчу? Для чаго аўтар піша яе гісторыю-“біяграфію”? Праз якія вобразы пісьменнікам выяўляюцца клапатлівыя і спажывецкія адносіны да прыроды? Раскрыйце

вобраз Валошкі і яго адносіны да пушчы. Вызначце мастацкую ролю эпізоду сустрэчы галоўнага героя з ваўком. Паразважайце, ці цікавым будзе гэты раман вучням 11 класа пры вывучэнні сучаснай літаратуры.

***У школьную праграму ўведзены наступныя творы:*** апавяданне Х. Лялько "Касцы" (5 кл.); урывак "Стары бабёр" з аповесці А. Жука "Паляванне на Апошняга Жураўля" (6 кл.); апавяданне Г. Далідовіча "Губаты" (8 кл.); раманы "Хроніка дзетдомаўскага саду", "Неруш" В. Казько, "Бежанцы" В. Карамазава, аповесці "Бярозавыя венікі" В. Карамазава, "Праклятая любоў" А. Жука, "Незламаная свечка" А. Казлова (11 кл.).

**Крыніцы**

1. Жук, А. Паляванне на Апошняга Жураўля : аповесць, апавяданні / А. Жук ; прадм. А. Кудраўца. – Мінск : Маст. літ., 1991. – 269 с.

2. Жук, А. Праклятая любоў : аповесці, апавяданні / А. Жук. – Мінск : Маст. літ., 2009. – 254 с. – (Школьная бібліятэка).

3. Жук, А. Халодная птушка. Паляванне на Апошняга Жураўля : аповесці / А. Жук // Выбраныя творы : у 2 т. Т. 1. Праклятая любоў : Кн. аповесцяў. Апавяданні / А. Жук ; прадм. З. Прыгодзіча. – Мінск, 1993. – С. 59–142; С. 142–282.

4. Казько, В. Выратуй і памілуй нас, чорны бусел : Аповесці, апавяданні, эсэ / В. Казько. – Мінск : Маст. літ., 1993. – 319 с.

5. Казько, В. Неруш : Раман / В. Казько. – Мінск : Маст. літ., 1983. – 430с.

6. Карамазаў, В. Дзяльба кабанчыка : Выбранае / В. Карамазаў ; прадм. М. Стральцова. – Мінск : Маст. літ., 1988. – 560 с.

7. Пархута, Я. Адзінец ( Аповесць пра палескага рабінзона) / Я. Пархута // Жальба жытняга коласа : Кн. падарожжаў / Я. Пархута. – Мінск, 1993. – С. 73–285.

8. Пташнікаў, І. Алімпіяда (Воблакі васьмідзесятых) : Раман / І. Пташнікаў ; паслясл. Г. Шупенькі. – Мінск : Маст. літ., 1985. – 623 с.

9. Пташнікаў, І. Мсціжы : Раман / І. Пташнікаў. – Мінск : Юнацтва, 1994. – 352 с.

10. Сачанка, Б. Ваўчыца з Чортавай Ямы / Б. Сачанка // Апошнія і першыя : Аповесці, раман у навелах, апавяданні / Б. Сачанка ; укл. Т. Сачанка. – Мінск, 2004. – С. 415–444.

**Асноўная літаратура**

1. Бязлепкіна, А. Вясковая проза / А. Бязлепкіна // 100 слоў пра сучасную беларускую літаратуру / А. Бязлепкіна. – Мінск : Лімарыус, 2012. – С. 45–46.

2. Козіч, В. Чалавек і прырода ў сучаснай беларускай прозе / В. Козіч. – 1998.

3. Макмілін, А. Горад і вёска / А. Макмілін // Пісьменства ў халодным клімаце. Беларуская літаратура ад 70-х гг. ХХ ст. да нашых дзён / А. Макмілін. – С. 23–54.

**Дадатковая літаратура**

1. Бульба, Г. Сум па чысціні / Г. Бульба // Беларус. думка. – 1996. – № 5. – С. 184–189 [пра аповесць Б. Сачанкі “Ваўчыца з Чортавай Ямы” і раман “Вялікі Лес”].

2. Гарадніцкі, Я. Кампазіцыйнае адзінства матываў у рамане І. Пташнікава “Мсціжы” / Я. Гарадніцкі // Весці БДПУ. Сер. 1. Педагогіка. Псіхалогія. Філалогія. – 2006. – № 1. – С. 86–89.

3. Жардзецкая, А. Прывабны і загадкавы свет Палесся : Па старонках твораў В. Казько / А. Жардзецкая // Родн. слова. – 2003. – № 7. – С. 25–27.

4. Ігнатовіч, Т. Жылі і жыць будзем / Т. Ігнатовіч // Літаратура і мастацтва. – 2002. – 22 сак. – С.14–15 [пра раман І. Пташнікава “Алімпіяда”].

5. Макмілін, А. Віктар Казько / А. Макмілін // Пісьменства ў халодным клімаце. Беларуская літаратура ад 70-х гг. ХХ ст. да нашых дзён / А. Макмілін. – С. 54–57 [пра раман “Неруш”, аповесці “Цвіце на Палессі груша”, “Выратуй і памілуй нас, чорны бусел”, інш.].

6. Мельнікава, А. Маральны патэнцыял твораў М. Вайцяшонак / А. Мельнікава // Выяўленча-мастацкія, арганізацыйныя і ідэалагічныя праблемы сучаснай беларускай літаратуры ў яе сувязях з грамадскімі практыкамі. – Мінск, 2009. – С. 292–296.

7. Прохар, М. Сродкі вобразнасці і аналітычнасці ў рамане І. Пташнікава “Мсціжы” / М. Прохар // Роднае слова. – 2001. – № 7. – С. 31–33.

8. Прыгодзіч, З. Ад праўды быту – да праўды быцця / З. Прыгодзіч // Выбраныя творы : у 2 т. Т. 1. Праклятая любоў : Кн. аповесцяў. Апавяданні / А. Жук ; прадм. З. Прыгодзіча. – Мінск, 1993. – С. 5–14.

Стральцова, В. “Радасць ад таго, што жыву” / В. Стральцова // Роднае слова. – 2005. – № 12. – С. 3–5 [тэма сэнсу жыцця ў творах А. Кудраўца].

9. Ткачук, В. Псіхалагічнае аблічча старасці ў аповесцях Алеся Жука "Чыгун" і "Халодная Птушка" / В. Ткачук // Полымя. – 2013. – № 3. – С. 120–127.

10. Цыбакова, С. Чалавек – прырода – Радзіма у рамане В. Казько "Неруш" і у аповесці А. Бароўскага "Княжабор" / С. Цыбакова // Веснік Мазырскага дзяржаунага педагагічнага ўніверсітэта. – 2013. – № 3. – С. 125–129.

ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ

**Чарнобыльская тэма ў беларускай літаратуры**

1. Назавіце беларускія творы чарнобыльскай тэматыкі (у тым ліку і калектыўныя зборнікі) і даследчыкаў тэмы ў літаратуразнаўстве.

2. Чаму менавіта паэты сталі першаадкрывальнікамі тэмы? Каго з беларускіх паэтаў і на якой падставе называюць летапісцам чарнобыльскай бяды? Падбярыце нізку вершаў чарнобыльскай тэматыкі, якія вас найбольш уразілі.

3. Назавіце першыя празаічныя творы пра Чарнобыль.

3.1 Паразважайце, чаму Б. Сачанка адным з першых сярод беларускіх празаікаў звярнуўся да асэнсавання тэмы Чарнобыля. На якіх аспектах чарнобыльскай бяды засяродзіўся пісьменнік у аповесцях “Родны кут” і “Еўка”? Як вырашаецца ў творах праблема родных каранёў? Ці будуць цікавымі гэтыя аповесці вучням пры вывучэнні сучаснай літаратуры ў 11 класе?

3.2 Якім чынам у апавяданні “Львы” І. Пташнікаву ўдалося перадаць фізічнае ўздзеянне радыяцыі на ўсё жывое? Чаму галоўным героем твора пісьменнік зрабіў сабаку? Як вы разумееце назву апавядання? Ці будзеце рэкамендаваць апавяданне “Львы” вучням 7 класа для пазакласнага чытання?

3.3 Якія аспекты чарнобыльскай трагедыі знайшлі адлюстраванне ў рамане І. Шамякіна “Злая зорка”? Раскажыце пра выяўленне ў творы Чарнобыля фізічнага і маральнага. Як праз вобраз Лізы Пустаход паказаны драматычны лёс чарнобыльскіх перасяленцаў? Для чаго ў “Злой зорцы” пісьменнік спалучыў тэмы Чарнобыля і Афганістана? Раскажыце пра іх мастацкае вырашэнне праз вобразную сістэму твора. Акрэсліце хрысціянскія матывы ў рамане, сімвалічны сэнс яго назвы. Знайдзіце вобразы-сімвалы і паразважайце пра іх ролю ў творы.

3.4 Якія новыя аспекты асэнсавання трагічных падзей Чарнобыля і Афганістана выявіліся ў аповесці І. Шамякіна “Зона павышанай радыяцыі” і апавяданні В. Карамазава “Супраць неба – на зямлі”?

3.5 Якія праблемы постчарнобыльскай рэчаіснасці выявіў В. Быкаў у аповесці “Ваўчыная яма”? Праз вобразную сістэму твора раскрыйце аўтарскую канцэпцыю “чарнобыля” фізічнага і маральнага. Які новы аспект асэнсавання прычын чарнобыльскай катастрофы знайшоў выяўленне ў быкаўскай аповесці?

3.6 Якое мастацкае вырашэнне знайшоў “чарнобыль” маральны ў аповесцях В. Казько “Выратуй і памілуй нас, чорны бусел” і В. Карамазава “Краем белага шляху”?

3.7 Чым сярод твораў чарнобыльскай тэматыкі вылучаецца кніга С. Алексіевіч “Чарнобыльская малітва”? Што спрыяла сусветнай вядомасці твора? Як вы разумееце назву кнігі і яе падзагаловак? Якія старонкі кнігі кранулі найбольш?

4. Хто з беларускіх пісьменнікаў і ў якіх творах увасобіў тэму Чарнобыля ў драматургіі?

4.1 На якіх аспектах асэнсавання чарнобыльскай бяды засяродзіліся А. Дудараў у п’есе “Адцуранне” і А. Петрашкевіч у п’есе “Дагарэла свечачка”?

5. Ці ёсць падставы чарнобыльскую тэму лічыць адной з вядучых і самай балючай у сучаснай літаратуры? Адказ аргументуйце.

***У школьную праграму ўведзены наступныя творы чарнобыльскай тэматыкі:*** апавяданне “Львы” І. Пташнікава (7 кл., пазакл. чыт.), раман “Злая зорка” І. Шамякіна, “Пісьмо ў рай” А. Савіцкага, аповесці “Родны кут”, “Еўка” Б. Сачанкі, Л. Левановіча “Палыновы вецер” (11 кл.).

**Крыніцы**


1. Глушакоў, У. Развітанне на пачатку вясны : сямейная хроніка / У. Глушакоў ; маст. У. Сытчанка. – Мінск : Юнацтва, 2001. – 511с. : іл.

2. Казько, В. Выратуй і памілуй нас, чорны бусел : аповесць / В. Казько // Выратуй і памілуй нас, чорны бусел : аповесці, апавяданні, эсэ / В. Казько. – Мінск, 1993. – С. 4–147.

3. Казько, В. Сенакос у канцы красавіка : апавяданне / В. Казько // Выратуй і памілуй нас, чорны бусел : аповесці, апавяданні, эсэ / В. Казько. – Мінск, 1993. – С. 232–245.

4. Карамазаў, В. Супраць неба – на зямлі : апавяданне / В. Карамазаў // Дзікі голуб : зб. сучас. беларус. прозы і крытыкі / Укл. М. Мінзер. – Мінск, 2011. – С. 63–88.

5. Кукса, В. І верыла ў цуд… : аповесці, апавяданні / В. Кукса. – Мінск : Дом прэсы, 1999. – 96 с., 1 іл партр.

6. Левановіч, Л. Вяртанне ў радыяцыю : аповесць, апавяданні, нарысы / Л. Левановіч ; маст. К. Ракіцкі. – Мінск : Юнацтва, 1997. – 222 с.

7. Левановіч, Л. Палыновы вецер : раман / Л. Левановіч. – Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2009. – 222 с.

8. Прайсці праз зону : Проза. Паэзія. Публіцыстыка / Укл. І. Бутовіч ; прадм. І. Шамякіна ; маст. У. Гардзеенка. – Мінск : Маст. літ., 1996. – 543 с. ; 16 каляр. іл.

9. Прайсці праз зону. Кн. 2. Проза. Паэзія. Публіцыстыка / Укл. І. Бутовіч; маст. В. Шкаруба. – Мінск : Маст. літ., 2001. – 558 с. ; 12 іл.

10. Пташнікаў, І. Львы : Апавяданні / І. Пташнікаў. – Мінск : Юнацтва, 1991. – 217 с.

11. Рыбік, Н. Права на адсяленне : апавяданні / Н. Рыбік. – Мінск : Беларускі дом прэсы, 2001. – 127 с. : партр.

12. Сачанка, Б. Родны кут / Б. Сачанка // Апошнія і першыя : Аповесці, раман у навелах, апавяданні / Б. Сачанка ; укл. Т. Сачанка. – Мінск, 2004. – С. 283–398.

13. Сачанка, Б. Еўка / Б. Сачанка // Родны кут : Аповесці. Апавяданні. Нарыс. Эсэ / Б. Сачанка. – Мінск : Маст. літ., 1989. – С. 5–114.

14. Сачанка, Б. Родны кут / Б. Сачанка // Родны кут : Аповесці. Апавяданні. Нарыс / Б. Сачанка. – Мінск : Маст. літ., 1989. – С. 155–186.

15. Шамякін, І. Злая зорка : Раман / І. Шамякін ; маст. Ю. Валынец. – Мінск : Ураджай, 2000. – 351 с. : іл.

**Асноўная літаратура**

1. Афанасьеў, І. Чарнобыльскае светаадчуванне ў сучаснай беларускай літаратуры / І. Афанасьеў. – Мінск, 2001.

2. Бязлепкіна, А. Чарнобыльская проза / А. Бязлепкіна // 100 слоў пра сучасную беларускую літаратуру / А. Бязлепкіна. – Мінск : Лімарыус, 2012. – С. 199–200.

3. Макмілін, А. Чарнобыльская катастрофа ў прозе і паэзіі / А. Макмілін // Пісьменства ў халодным клімаце. Беларуская літаратура ад 70-х гг. ХХ ст. да нашых дзён / А. Макмілін. – С. 54–75.

**Дадатковая літаратура**

1. Бельскі, А. Пад знакам палыновай зоркі / А. Бельскі // Роднае слова. – 2006. – № 3. – С. 5–10; № 4. – С. 12–16.

2. Бельскі, А. Чулае сэрца сучасніка / А. Бельскі // Дзікі голуб : зб. сучас. беларус. прозы і крытыкі / Укл. М. Мінзер. – Мінск, 2011. – С. 58–62 [пра апавяданні В. Карамазава "Жанчына ў чорным і Афган" і "Супраць неба – на зямлі"].

3. Жардзецкая, А. Зямля, параненая Чарнобылем : Праблема ўзаемаадносін чалавека і прыроды ў творах В. Казько, А. Кажадуба, І. Шамякіна / А. Жардзецкая // Роднае слова. – 2003. – № 10. – С. 28–30.

4. Кузьміч, Н. З болеем і трывогай у сэрцы : Чарнобыльская тэма ў аповесці "Родны кут" Б. Сачанкі / Н. Кузьміч // Роднае слова. – 2006. – № 5. – С. 5–6.

5. Прохар, М. Рэалізацыя эсхаталагічнага матыву ў вобразах жывой прыроды ў творах беларускіх і ўкраінскіх пісьменнікаў пра Чарнобыль / М. Прохар // Полымя. – 2013. – № 9. – С. 120–127.

6. Прохар, М. Экалогія прыроды і экалогія душы : Чарнобыль у творчасці В. Казько, І. Пташнікава і В. Карамазава / М. Прохар // Полымя. – 2007. – № 4. – С.194–209.

7. Стральцова, В. "Раскіданае гняздо" : матыў страты каранёў у "чарнобыльскай навелістыцы" / В. Стральцова // Сучасная беларуская літаратура і працэсы славянскага культурна-цывілізацыйнага ўзаемадзеяння. – Мінск, 2008. – С. 444–448.

## СУЧАСНАЯ ЛІТАРАТУРА БЕЛАРУСІ (другая палова 80-х – пачатак ХХІ ст.)

Перабудова і літаратура. Агульныя звесткі пра развіццё беларускай літаратуры ў другой палове 80-х – 90-я гг. Адкрыццё праўды пра гісторыю народа і лёс чалавека ў ХХ ст. Уплыў чарнобыльскай трагедыі на погляды і

светаадчуванне беларускіх пісьменнікаў. Трывога літаратуры пра вечныя духоўныя каштоўнасці, захаванне гуманізму. Праблемна-тэматычны і жанрава-стылёвы дыяпазон сучаснай літаратуры.

Традыцыі і наватарства ў сучаснай літаратуры. Эстэтыка-выяўленчыя кірункі, плыні, тэндэнцыі: рэалізм, неарамантызм, авангардызм, імпрэсіянізм, постмадэрнізм і інш. Сувязь літаратуры з філасофіяй экзістэнцыялізму.

Літаратурна-выдавецкі працэс у сучаснай Беларусі. СМІ ў беларускай культурнай прасторы. Літаратурны перыядычны друк (газета “Літаратура і мастацтва”, часопісы “Полымя”, “Маладосць” і інш.). Творчыя аб’яднанні і суполкі (“Узлёт”, “Тутэйшыя”, “Бум- Бам-Літ”, “Літаратурнае прадмесце”, інш.). Авангардныя пошукі творчай моладзі. Складанасці і праблемы сучаснага літаратурнага працэсу.

Полілінгвістычнасць літаратуры Беларусі. Стварэнне мастацкіх твораў на розных мовах: рускай, польскай, ідыш, іспанскай, нямецкай, курдскай, армянскай і інш. Літаратурны друк на рускай мове. Пісьменнікі, якія пісалі ці пішуць на дзвюх або некалькіх мовах (А. Адамовіч, Р. Рэлес, Г. Чарказян, інш.). Рускамоўная літаратура Беларусі (М. Чаргінец, С. Алексіевіч, А. Аўруцін, Э. Скобелеў, інш.).

Роля і стан мастацкага перакладу на сучасным этапе. Замежныя пісьменнікі на беларускай мове. Выданне ў 80-я – першай палове 90-х гг. альманахаў, кніжных серый, хрэстаматый па літаратуры народаў свету. Плённы і прадуктыўны перыяд у развіцці сучаснага літаратурнага перакладу. Выхад на беларускай мове кніг Ё.-В. Гётэ, А. Міцкевіча, Дантэ Аліг’еры, Г. Сянкевіча, інш. Пераклады біблейскіх тэкстаў, зробленыя А. Клышкам і В. Сёмухам. Анталогіі польскай паэзіі Я. Чыквіна і А. Лойкі. Пераклад на беларускую мову славутых пісьменнікаў славянскага свету (Т. Шаўчэнкі, А. Пушкіна, С. Ясеніна, Б. Пастарнака, М. Цвятаевай, Л. Стафа, Ч. Мілаша, В. Шымборскай, інш.). Творчая дзейнасць найбольш значных сучасных перакладчыкаў (Я. Семяжон, В. Сёмуха, І. Чарота, Н. Гілевіч, Н. Мацяш, інш.). Беларуская школа перакладу.

Беларускае мастацкае слова ў сусветнай культурнай прасторы. Міжнародныя літаратурныя сувязі і кантакты. Уганараванне беларускіх пісьменнікаў дзяржаўнымі ўзнагародамі і літаратурнымі прэміямі іншых краін. Беларуская літаратура ў свеце, выхад анталогій беларускай паэзіі ў Расіі, Балгарыі, Югаславіі, інш. Перакладчыкі і папулярызатары беларускай мастацкай літаратуры за мяжой: Ф. Няўважны, Е. Путрамант, В. Жыдліцкі, Ч. Сэнюх, С. Паптонеў, Р. Рандаў, В. Сінг, М. Абала, Р. Эўцімава, інш.

Беларуская літаратура замежжа (М. Сяднёў, Я. Юхнавец, М. Кавыль, А. Бярозка, У. Клішэвіч, інш.). Дзейнасць літаратурнага аб’яднання "Белавежа" ў Польшчы (А. Барскі, Г. Валкавыцкі, І. Чыквін, Н. Артымовіч, інш.). Творчасць пісьменнікаў замежжа ў агульнанацыянальным літаратурным кантэксце.

## Асноўная літаратура


1. Бязлепкіна, А. 100 слоў пра сучасную беларускую літаратуру / А. Бязлепкіна. – Мінск : Лімарыус, 2012. – 224 с.

2. Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. Т. 4. Кн. 2. 1986–2000 / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы ; навук. рэд. У. Гніламёдаў, С. Лаўшук. – Мінск : Беларус. навука, 2003. – 975 с.

3. З росных сцяжын : аўтабіяграфіі пісьменнікаў Беларусі / Уклад. М. Мінзер. – Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2009. – 464 с.

4. Кісліцына, Г. Новая літаратурная сітуацыя : змена культурнай парадыгмы / Г. Кісліцына ; навук. рэд. В. Жураўлёў ; НАН Беларусі, Ін-т мовы і літаратуры. – Мінск : Логвінаў, 2000. – 206 с.

5. Кісліцына, Г. Сучасны літаратурны працэс : актуальныя стратэгіі выжывання нацыянальнай літаратуры / Г. Кісліцына // Вестник МГЛУ. Серия 1. Филология. – 2013. – № 4. – С. 163–170.

6. Макмілін, А. Пісьменства ў халодным клімаце. Беларуская літаратура ад 70-х гг. ХХ ст. да нашых дзён / А. Макмілін. – 910 с.

7. Максімовіч, В. Шляхам спазнання існасці : Літаратурны працэс другой паловы XIX – пачатку XXI ст. у постацях / В. Максімовіч ; НАН Беларусі, Ін-т філасофіі ; навук. рэд. У. Конан. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – 239 с.

8. Падаляк, Т. Дыялогі на мяжы стагоддзяў : класікі і сучаснікі ў інтэр'еры часу : у 2 ч. Ч. 1. / Т. Падаляк ; прадм. А. Карлюкевіча. – Мінск : Звязда, 2013. – 215 с.

9. Сучасная беларуская літаратура і працэсы славянскага культурна-цывілізаванага ўзаемадзеяння : Матэрыялы Міжн. навук.-практ. канф. (да 80-годдзя НАН Беларусі), Мінск, 28 мая 2008 г. / НАН Беларусі, Ін-т мовы і літаратуры ; рэдкал. В. Максімовіч (навук. рэд.) і інш. – Мінск : Права і эканоміка, 2008. – 549 с.

10. Чалавечае вымярэнне ў сучаснай беларускай літаратуры / М. Тычына і інш. ; навук. рэд. М. Тычына ; НАН Беларусі, Ін-т мовы і літаратуры. – Мінск : Беларус. навука, 2010. – 458 с.


## Дадатковая літаратура


1. Бязлепкіна, А. Разам і паасобку : таварыства "Тутэйшыя" : Гісторыя. Асобы. Жанры / А. Бязлепкіна. – Мінск : МГА " Бел. кнігазб.", 2003. – 163 с.

2. Кісліцына, Г. Літаратурна-мастацкая крытыка 2000-х гг. : праблемы, здабыткі, адкрыцці / Г. Кісліцына // Весці НАН Беларусі. Серыя гуманіт. навук. – 2013. – № 1. – С. 84–87.

3. Максімюк, Я. Словы ў голым полі : беларуская літаратура 1990-х у снах, успамінах і фотаздымках / Я. Максімюк. – Мінск : Логвінаў, 2011. – 222 с.

4. Рублеўская, Л. Белы крыж над белаю зямлёю… : Штрыхі да партрэта сучаснай беларускай літаратуры / Л. Рублеўская // Дзеяслоў. – 2002. – № 1. – С. 203–209.

# СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ПРОЗА

Актывізацыя ідэйна-творчых пошукаў, пашырэнне выяўленчых магчымасцей беларускай прозы 80–90-х гг. Мастацкія набыткі ў жанрах рамана, аповесці і апавядання. Разнастайнасць тэматыкі і праблематыкі сучаснай прозы. Лёс беларускага народа ў XX ст. у асэнсаванні сучаснай прозы (раман В. Карамазава “Бежанцы” і інш.).

Трагічная праўда часу ў творах другой паловы 80–90-х гг., (А. Адамовіч, І. Шамякін, І. Чыгрынаў і інш.). Адлюстраванне драматызму даваеннага часу В. Быкавым (“Аблава”, “Сцюжа”, “Жоўты пясочак”, інш.).
Творы, напісаныя на мемуарным матэрыяле: М. Бяганская “Мая Галгофа” (1990), Л. Геніюш “Споведзь” (1991), С. Грахоўскі “Такія сінія снягі” (1988), “Зона маўчання” (1990), “З воўчым білетам” (1991), П. Крэнь “Унжлаг” (1999), Б. Мікуліч “Аповесць для сябе” (1987, 1988; поўнае выд. – 1993), П. Пруднікаў “Яжовыя рукавіцы” (1989), “Пекла” (1991).

Паказ пасляваеннага жыцця ў рамане Г. Далідовіча “Заходнікі”. Даследаванне складаных сацыяльных працэсаў сучаснасці, узмацненне ўвагі да маральна-псіхалагічных, экалагічных і агульначалавечых праблем (І. Шамякін, В. Казько, В. Адамчык, А. Федарэнка і інш.). Чарнобыльская тэма ў творах беларускіх пісьменнікаў: І. Пташнікаў “Львы”, І. Шамякін “Злая зорка”, В. Карамазаў “Краем белага шляху” і інш.

Два тыпы свядомасці і мастацкай вобразнасці, сфарміраваныя рознымі ўмовамі і рэаліямі жыцця – вясковага і гарадскога. Матывы лёсу вёскі, роднай зямлі, бацькоўскага кутка ў беларускай літаратуры. Сацыяльныя і маральна-этычныя праблемы ў прозе пра беларускую вёску (А. Жук, В. Казько, А. Федарэнка і інш.). Праблема адносін чалавека і прыроды – балючы нерв вясковой прозы. Паварот сучаснай беларускай літаратуры ад традыцыйнай вясковай тэматыкі да ўвасаблення гарадской рэчаіснасці. Традыцыя мастацкага урбанізму і творчасць М. Стральцова. Прыход у літаратуру “дзяцей горада”. Горад у сучаснай паэзіі (Г. Булыка, А. Глобус, Л. Рублеўская і інш.). Адлюстраванне урбанізаванага жыцця і побыту ў празаічных творах А. Асташонка, Г. Багданавай і інш. Мастацка-выяўленчыя асаблівасці гарадской прозы.

Гістарызм мыслення беларускіх пісьменнікаў. Сінтэз гістарычнай праўды з элементамі мастацкага домыслу. Вызначальныя рысы гістарычнага жанру. Мінулае Беларусі ў творчасці У. Караткевіча, наватарства пісьменніка і яго ўплыў на прадстаўнікоў маладзейшых літаратурных пакаленняў. Рамантызацыя далёкага мінулага, зварот да міфалогіі, легендарнага матэрыялу. Галерэя гістарычных вобразаў у сучаснай літаратуры. Падзеі і вобразы беларускай гісторыі ў празаічных творах сучасных пісьменнікаў (Л. Дайнека, У. Арлоў, В. Іпатава, Г. Далідовіч, К. Тарасаў, В. Чаропка, А. Наварыч, інш.).

Пашырэнне мастацкага досведу ў сучаснай літаратуры. Тэндэнцыя да звужэння тэкставых рамак празаічных твораў. Сінтэтычнасць і дынамізм жанравых структур. Кніга навел Г. Марчука “Урсула” (2003). Своеасаблівасць літаратурнай прыпавесці (кніга Я. Сіпакова “Тыя, што ідуць”, інш.). Лірычныя мініяцюры Я. Брыля (кнігі “Вячэрняе”, “Пішу як жыву”, “Дзе скарб ваш” і інш.). Формы і прыёмы мастацкай умоўнасці (В. Казько, У. Рубанаў, А. Казлоў, інш.). Фантасмагорыя і містыка як спосаб мастацкага светаасэнсавання. Антыутопія ў сучаснай літаратуры. Выкарыстанне пісьменнікамі міфалагічных і казачных сюжэтаў і матываў. Узбагачэнне беларускай фантастыкі. Навукова-фантастычныя гіпотэзы і іх уплыў на мастацкую літаратуру. Жанр фэнтэзі ў сучасным мастацтве. Адметнасць стылістыкі і кампазіцыі фантастычных твораў Л. Дайнекі “Чалавек з брыльянтавым сэрцам”, Я. Сіпакова “Блуканні па іншасвеце”, В. Гігевіча “Карабель”, “Палтэргейст”, “Кентаўры” і інш. Інтэлектуальная і маральна-этычная заглыбленасць прозы В. Гігевіча, яе гуманістычная скіраванасць.

Паэтыка дэтэктыўнай літаратуры (займальны сюжэт, прынцып загадкавасці, вострая інтрыга і інш.). У. Караткевіч і эвалюцыя дэтэктыўнага жанру ў беларускай літаратуры. Выкарыстанне пісьменнікамі вопыту сусветнай літаратуры: спецыфіка пабудовы сюжэта, аснова канфлікту, праблематыка і асаблівасці аўтарскага аповеду (Г. Марчук, Ю. Станкевіч, М. Клімковіч, М. Адамчык, Л. Рублеўская і інш.).

Празаічныя набыткі пісьменнікаў малодшага пакалення (А. Федарэнкі, А. Глобуса, М. Шайбака, В. Чаропкі, А. Асташонка, інш.).

***У школьную праграму ўключаны наступныя творы:*** “Чужое багацце” Г. Марчука, “Падслуханая казка” А. Федарэнкі (5 кл.); урывак з “Аповесці чатырох падарожжаў”, “Гальштучнік” Р. Баравіковай (6 кл.); “Казкі астранаўта” Р. Баравіковай (7 кл.); навелы “Канон Богу”, “Канон Базару”, “Канон Гарыні”, “Канон Маці”, раман “Крык на хутары” Г. Марчука, аповесці “Крыло цішыні”, “Кулак”, кніга апавяданняў “Пяць струн”, зборнік “Тыя, хто ідуць” Я. Сіпакова, аповесці “Сцюжа”, “У тумане” В. Быкава, “Вір” І. Навуменкі, “Нямко” А. Адамовіча, раман І. Чыгрынава “Вяртанне да віны” (11 кл.).

## Крыніцы

1. Арлоў, У. Рэквіем для бензапілы : Аповесці. Апавяданні / У. Арлоў. – Мінск : Маст. літ., 1998. – 240 с.

2. Гніламёдаў, У. Вяртанне : раман / У. Гніламёдаў. – Мінск : Маст. літ., 2008. – 429 с.

3. Грахоўскі, С. Зона маўчання. “Такія сінія снягі” / С. Грахоўскі // Споведзь : Аповесці і вершы / С. Грахоўскі. – Мінск : Маст. літ., 1990. – 399 с.

4. Дзікі голуб : зб. сучас. беларус. прозы і крытыкі / Уклад. М. Мінзер. – Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2011. – 232 с.

5. Казлоў, А.С. Незламаная свечка / А. Казлоў. – Мінск : Маст. літ., 2000. – 222 с.

6. Казлоў, А.С. Юргон : раманы, аповесці, апавяданні / А. Казлоў. – Мінск : Маст. літ., 2006. – 255 с. – (Беларуская проза XXI стагоддзя).

7. Карона Вітаўта Вялікага : раманы, аповесці, апавяданні / Уклад. У.М. Сіўчыкава, А.У. Сіўчыкавай. – Мінск : Маст. літ., 2004. – 510 с. – (Сучасны беларускі дэтэктыў).

8. Левановіч, Л. Сіняе лета : раман, апавяданні, эсэ / Л. Левановіч. – Мінск : Маст. літ., 2005. – 358 с.

9. Лялько, Х. Світанак над бярозамі : аповесць, апавяданні / Х. Лялько. – Мінск : Юнацтва, 1989. – 223 с.

10. Пташнікаў, І. Пагоня : аповесць, апавяданні / І. Пташнікаў ; прадм. С. Андраюка. – Мінск : Маст. літ., 2009. – 446 с.

11. Рублеўская, Л.І. Ночы на Плябанскіх млынах : раман, аповесць, апавяданні / Л. Рублеўская. – Мінск : Маст. літ., 2013. – 526 с.

12. Рублеўская, Л. Пярсцёнак апошняга імператара : раман, аповесць, апавяданні / Л. Рублеўская. – Мінск : Маст. літ., 2005. – 279 с. – (Сучасны беларускі дэтэктыў).

13. Рублеўская, Л. Сутарэнні Ромула : раманы / Л. Рублеўская. – Мінск : Кнігазбор, 2012. – 519 с. – (Кнігарня пісьменніка. Вып. 26.).

14. Рублеўская, Л. Сэрца мармуровага анёла : аповесці, раман / Л. Рублеўская. – Мінск : Маст. літ., 2012. – 348 с.

15. Сіпакоў, Я. Тыя, што ідуць : Кніга прытчаў / Я. Сіпакоў. – Мінск : Маст. літ., 1993. – 175 с.

16. Сіпакоў, Я. Журба ў стылі рэтра : Кніга прозы / Я. Сіпакоў. – Мінск : Маст. літ., 1990. – 311 с.

17. Станкевіч, Ю. Любіць ноч – права пацукоў : раман, аповесці, апавяданні / Ю. Станкевіч. – Мінск : Маст. літ., 2000. – 333 с.

18. Сучасная беларуская проза : Традыцыі і наватарства : творы ад 60-х да нашых дзён / Уклад. У. Сіўчыкава, М. Тычыны ; прадм. М. Тычыны. – Мінск : Сэр-Віт, 2003. – 703 с.

19. Сямнаццатай вясной : зб. сучас. беларус. прозы і крытыкі / Уклад. Л. Алейнік, М. Мінзер. – 2-е выд, папраўл. – Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2012. – 190 с.

20. Федарэнка, А. Ланцуг : аповесці / А. Федарэнка. – Мінск : Маст. літ., 2012. – 237 с. – (Беларуская проза XXI стагоддзя).

21. Федарэнка, А. Мяжа : раман-эсэ, апавяданні / А. Федарэнка. – Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2011. – 262 с.

22. Федарэнка, А. Нічые : аповесці, раман / А. Федарэнка. – Мінск : Маст. літ., 2009. – 430 с.

## Асноўная літаратура

1. Андраюк, С. Проза / С. Андраюк // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. Т. 4. Кн. 2. 1986–2000 / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы ; навук. рэд. У. Гніламёдаў, С. Лаўшук. – Мінск : Беларус. навука, 2003. – С. 8–38.

2. Бельскі, А. Беларуская літаратура XX стагоддзя : гісторыя і сучаснасць / А. Бельскі. – Мінск : Аверсэв, 2005. – 270 с.

3. Жураўлёў, В. Класіка і літаратурная сучаснасць : духоўны патэнцыял чалавека / В. Жураўлёў ; НАН Беларусі, Ін-т мовы і літаратуры. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – 244 с.

4. Кісліціна, Г. Актуальныя праблемы сучаснай беларуская прозы / Г. Кісліціна // Веснік Магілёўска дзярж. ўн-та імя А. Куляшова. Сер. А. Гуманіт. навукі (гісторыя, філасофія, філалогія). – 2013. – № 2. – С. 77–82.

5. Макмілін, А. Проза // Пісьменства ў халодным клімаце. Беларуская літаратура ад 70-х гг. XX ст. да нашых дзён / А. Макмілін. – С. 237–308.

6. Скрозь "Маладосць" : не самая сумная кніжка пра грошы, чорны шакалад, пісьменнікаў і літаратуру / Уклад. С. Дзянісава. – Мінск : Звязда, 2013. – 270 с.

7. Сучасная літаратура : каардынаты ідэйна-мастацкага пошуку / НАН Беларусі, Ін-т мовы і літаратуры ; навук. рэд. В. Стральцова. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – 286 с.

## Дадатковая літаратура

1. Авласенко, Г. О "дневниковой прозе поэта" Виктора Шнипа / Г. Авласенко / Нёман. – 2013. – № 6. – С. 198–201.

2. Адамчик, В. День добрый, сын! / В. Адамчик ; пер. с белорус. Е. Хацкель // Нёман. – 2013. – № 4. – С. 144–154 [лісты В. Адамчыка малодшаму сыну].

3. Алешкевич, М. Кто на "Ланцугу" / М. Алешкевич // Нёман. – 2013. – № 4. – С. 186–188 [пра кнігу "Ланцуг" А. Федарэнкі].

4. Аммон, М.У. Беларуская фантастыка ў кантэсце сусветнай літаратурнай традыцыі : гістарычны аспект / М.У. Аммон // Известия Гомельского гос. ун-та имени Ф. Скорины. – 2013. – № 1. – С. 71–74.

5. Андраюк, С. На пераломе : Беларуская проза 1986–2001 гг. / С. Андраюк // Полымя. – 2003. – № 1. – С. 175–201.

6. Аммон, М. Матыў фантастычнага падарожжа ў творчасці Вячаслава Адамчыка / М. Аммон // Роднае слова. – 2013. – № 6. – С. 3–5.

7. Андраюк, С. Літаратура на мяжы стагоддзяў : Колькі разважанняў пра творы Я. Брыля і В. Быкава / С. Андраюк // Роднае слова. – 2003. – № 3. – С. 15–17.

8. Бельскі, А. Сучасная літаратура Беларусі : дапам. для наст. / А. Бельскі. – Мінск : Аверсэв, 2000. – 127 с.

9. Бязлепкіна, А. Герой сучаснай беларускай прозы / А. Бязлепкіна // 100 слоў пра сучасную беларускую літаратуру / А. Бязлепкіна. – Мінск : Лімарыус, 2012. – С. 51–52.

10. Бязлепкіна, А. Дэтэктыўная проза / А. Бязлепкіна // 100 слоў пра сучасную беларускую літаратуру / А. Бязлепкіна. – Мінск : Лімарыус, 2012. – С. 63–64.

11. Бязлепкіна, А. Жаночая проза / А. Бязлепкіна // 100 слоў пра сучасную беларускую літаратуру / А. Бязлепкіна. – Мінск : Лімарыус, 2012. – С. 67–68.

12. Бязлепкіна, А. Пазалітаратурныя фактары фарміравання аўтарскіх стратэгій беларускіх пісьменнікаў / А. Бязлепкіна // Мова – Літаратура – Культура. – Мінск, 2010. – С. 107–113.

13. Бязлепкіна, А. Эратычная літаратура / А. Бязлепкіна // 100 слоў пра сучасную беларускую літаратуру / А. Бязлепкіна. – Мінск : Лімарыус, 2012. – С. 203–204.

14. Васючэнка, П. Асцярожна! Кепскі фінал / Пятро Васючэнка ; гутарыла М. Дуброўская // Маладосць. – 2013. – № 8. – С. 10–11.

15. Дзенісюк, Н. “Смерць суб’екта”, альбо Праблема літаратурнага героя ў постмадэрнісцкіх тэкстах / Н. Дзенісюк // Выяўленча-мастацкія, арганізацыйныя і ідэалагічныя праблемы сучаснай беларускай літаратуры ў яе сувязях з грамадскімі практыкамі. – Мінск, 2009. – С. 111–116.

16. Дубашынскі Р. Прыпавесць у сучаснай беларускай прозе / Р. Дубашынскі ; НАН Беларусі, Ін-т мовы і літаратуры. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – 127 с.

17. Зенава, Г. Фальклорна-фантастычны кірунак творчага пошуку А. Казлова / Г. Зенава // Роднае слова. – 2003. – № 9. – С. 24–27.

18. Лапіцкая, А. Гісторыя кахання і майстар-клас / А. Лапіцкая // Маладосць. – 2013. – № 9. – С. 107–110. – Рэц. на кнігу : Федарэнка, А. Ланцуг : аповесці / А. Федарэнка. – Мінск : Маст. літ., 2012 – 240 с. – (Беларуская проза XXI стагоддзя).

19. Локун, В. На духоўным пераломе : Агляд прозы апошніх гадоў / В. Локун // Полымя. – 2002. – № 9–10. – С. 246–268.

20. Локун, В. Праз церні да дасканаласці : Беларускі раман на пачатку XXI ст. / В. Локун // Беларус. думка. – 2004. – № 5. – С. 165–171.

21. Макмілін, А. Пісьменства ў халодным клімаце. Беларуская літаратура ад 70-х гг. XX ст. да нашых дзён / А. Макмілін. – 910 с.

22. Рагуля, А. Плынь : карціна нацыянальнага быцця ў раманах Леаніда Левановіча / А. Рагуля // Полымя. – 2013. – № 2. – С. 148–164.

23. Сінькова, Л. Літаратура нацыянальная або гетэрагенная / Л. Сінькова // Роднае слова. – 2013. – № 12. – С. 16–20.

24. Стральцова, В. Шлях да сябе : Сучасная аўтабіяграфічная проза як мастацкая сістэма / В. Стральцова. – Мінск : Бел. навука, 2002. – 112 с.

25. Фіцнер, Т. Творы А. Казлова праз прызму "жаночага чытання" / Т. Фіцнер // Известия Гомельского гос. ун-та имени Ф. Скорины. – 2013. – № 1. – С. 94–98.

26. Шынкарэнка, В. Спасцігаць не для забыцця : Па выбраных старонках сучаснай беларускай прозы / В. Шынкарэнка // Роднае слова. – 2003. – № 4. – С. 13–18.

27. Яніцкі, М. Адлюстраванне рэальнага і ірэальнага свету ў аповесці-фантасмагорыі А. Казлова "Я і прарок-уродка" / М. Яніцкі // Веснік Брэсцкага універсітэта. Серыя 3. Філалогія, педагогіка, псіхалогія. – 2013. – № 1. – С. 43–47.

## СУЧАСНАЯ ГІСТАРЫЧНАЯ ПРОЗА

Умоўнасць тэрміна "гістарычная проза" для пазначэння прозы пра гістарычныя падзеі, сведкам якіх аўтар быць не мог, а героямі могуць быць рэальныя гістарычныя асобы. Функцыі гістарычнай прозы: эўрэстычная (распаўсюджванне ведаў пра гісторыю), аксіялагічная (фарміраванне іерархіі каштоўнасцей, нормаў маралі і жыццёвых арыенціраў), ідэалагічная (фарміраванне і ўмацаванне станоўчага ці адмоўнага стаўлення да пэўных гістарычных працэсаў ці з'яў). Сучаснае літаратуразнаўства (А. Дарагакупец, А. Бязлепкіна, С. Андраюк, інш.) аб тэндэнцыях развіцця гістарычнай прозы. Тэндэнцыя рамантызацыі і інтэлектуалізацыі гісторыі ў творах сучасных пісьменнікаў паводле А. Дарагакупец, А. Бязлепкінай. Дзве тэндэнцыі ў сучаснай гістарычнай літаратуры паводле С. Андраюка: узнаўленне канкрэтных фактаў, падзей, гістарычных асоб і творы гераізаванага зместу і рамантызаванай формы мастацкага ўвасаблення. Зліццё гэтых дзвюх тэндэнцый у раманах-даследаваннях А. Лойкі "Францыск Скарына, або Сонца маладзіковае" (1989), В. Коўтун "Крыж міласэрнасці" (1-я кн. – 1987; 2-я – 1996).

У. Караткевіч як заснавальнік гістарычнай прозы другой паловы ХХ ст. Найбольш вядомыя гістарычныя творы пісьменніка. Адносіны У. Караткевіча да гісторыі як да легенды і прытчы, рамантызацыя мінулага і яго дзеячаў. Дэтэктыўныя элементы ў Караткевічавай гістарычнай прозе.

Наяўнасць у сучаснай беларускай літаратуры "гістарычнай школы", заснаванай У. Караткевічам (У. Дайнека, У. Арлоў, В. Іпатава, Л. Рублеўская, В. Чаропка, А. Наварыч, інш.). Працяг традыцый рамантызацыі мінулага ў творах В. Іпатавай, А. Наварыча, Л. Рублеўскай, інш. Гістарычныя творы Г. Далідовіча "Кліч роднага звона" (1999), І. Шамякіна "Вялікая княгіня" (1998), В. Чаропкі "Храм без Бога" (1991), А. Наварыча "Літоўскі воўк" (2003), З. Дудзюк "Год 1812" (2002), інш.

**Творчасць Леаніда Дайнекі** (нар. – 1940 г.)

Уваход ў літаратуру лірычнымі "Галасамі" (1969). Арыгінальныя зборнікі вершаў "Бераг чакання" (1972), "Начныя тэлеграмы" (1974), "Мая вясна саракавая" (1979), "Вечнае імгненне" (1985), кніга выбранага "Сняжынкі пад агнём" (1989).

Першыя апавяданні і нарысы ў армейскім друку ў 1960–1963 гадах. Першы зборнік апавяданняў "Бацькава крыніца" (1976). Першае сур'ёзнае сцверджанне Л. Дайнекі ў буйной эпічнай форме – выхад у свет гісторыка-рэвалюцыйнай дылогіі "Людзі і маланкі" (1978) і "Запомнім сябе маладымі" (1981), першага ў айчыннай літаратуры гістарычнага раманнага цыкла. Сканцэнтраванасць на сацыяльна-грамадскіх і духоўных пытаннях сучаснасці, нядаўняга ваеннага мінулага ў рамане "Футбол на замініраваным полі" (1983). Лірычнае і драматычнае ў стылёвай манеры твора. Буйны прыгодніцка-фантастычны раман "Чалавек з брыліянтавым сэрцам" (1992).

Канцэпцыя мінулага ў гістарычных раманах Л. Дайнекі "Меч князя Вячкі" (1985), "След ваўкалака" (1988), "Жалезныя жалуды" (1990). Сюжэтныя лініі і архітэктоніка раманаў. Ідэйна-мастацкі змест твораў, характарыстыка асноўных вобразаў. Майстэрства аўтара ў пабудове сюжэта (дынамізм, займальнасць, прыгодніцкія калізіі, інш.).

Жорсткая вайна Полацкага княства з крыжакамі ў XIII ст. – канва рамана "Меч князя Вячкі". Выкарыстанне пісьменнікам матэрыялаў "Хронікі Лівоніі" Генрыха Латвійскага 1224–1227 гадоў. Вобраз князя Вячкі як няскоранага патрыёта роднай зямлі. Паказ аўтарам (у адступе ад гістарычнай праўды) вобраза полацкага князя Уладзіміра. Вобразы захопнікаў (рыжскага епіскапа Альберта і храніста Генрыха) як творчая ўдача пісьменніка. Трагічны лёс дачкі Вячкі Соф'і. Вобразы Якава Палачаніна, Клімяты Анарука, інш. Яркія карціны жыцця, побыту, сацыяльных адносін розных слаёў грамадства, выяўленне светаўспрымання нашых продкаў ў творы.

Бурнае XI ст., звязанае з імем славутага полацкага князя Усяслава Чарадзея, у рамане "След ваўкалака". Супярэчлівасць вобраза галоўнага героя. Паказ Л. Дайнекам дваяверства нашых продкаў: барацьбы хрысціянства з паганствам. Вобраз пячорніка Мяфодзія. Вырашэнне пісьменнікам быційных праблем сэнсу чалавечага жыцця, веры, інш.

Вобраз заснавальніка Вялікага княства Літоўскага Міндоўга ў рамане "Жалезныя жалуды". Аўтарскія адносіны да гістарычнай асобы. Ідэя твора. Мастацкая функцыя Казлейкі і Жэрнаса ў вобразнай сістэме твора.

Прысуджэнне Л. Дайнеку Літаратурнай прэміі імя І. Мележа (1987) за раман "Меч князя Вячкі" і Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя К. Каліноўскага (1990) за раманы "Меч князя Вячкі" і "След ваўкалака".

**Творчасць Уладзіміра Арлова** (нар. – 1953 г.).

Шлях у літаратуру. Паэтычныя зборнікі "Там, за дзвярыма : Вершы ў прозе" (1991), "Фаўна сноў" (1995), інш. Празаічныя зборнікі пра сучаснасць

“Добры дзень, мая шыпшына” (1986, Прэмія ленінскага камсамола) і “Рэквіем для бензапілы” (1998). Гістарычныя эсэ і нарысы “Асветніца з роду Усяслава” (1989), “Евфросиния Полоцкая (1992), “Совершенно секретно”, або Адзін у трох іпастасях” (1992), “Мой радавод да пятага калена” (1993), “Адкуль наш род” (Мінск, 1996; Вільня, 2000), “Тайны полоцкой истории” (1995), “Жыватворны сімвал бацькаўшчыны” (Уклад. У. Арлоў, 1998). Праца ў суаўтарстве над гістарычнымі кнігамі : В. Орлов, Г. Саганович “Десять веков белорусской истории (862–1818): События. Даты. Иллюстрации” (Вильня, 2001); У. Арлоў, З. Герасімовіч “Краіна Беларусь” (Славакія, 2003). У. Арлоў як аўтар сцэнарыяў навукова-дакументальных фільмаў “Ефросиния Полоцкая”, “Полоцкие лабиринты”, “Симеон Полоцкий”.

Узнагароды У. Арлова за ўклад у распрацоўку тэмы гістарычнага мінулага Беларусі: Медаль Ф. Скарыны (1991), Выдавецкая прэмія імя У. Караткевіча (1993), Літаратурная прэмія Ф. Багушэвіча Беларускага ПЭН-цэнтра (1996), Літаратурная прэмія Еўрапейскі паэт свабоды (Гданьск, 2010).

Занепакоенасць і праўдзівы аповед маладога пісьменніка пра занядбаную беларускую гісторыю, мову, культуру, няведанне і нешанаванне беларусамі сваёй нацыянальнай спадчыны ў аповесці “І вярталіся мы…” з першага празаічнага зборніка “Добры дзень, мая шыпшына”. Вобраз Рамана Галубовіча як носьбіта высокіх унутраных якасцяў і духоўных каштоўнасцяў, нацыянальнага інтэлігента, беларуса-патрыёта, які захоўвае ў сабе повязь з духоўна-гістарычнымі, культурнымі і маральнымі каранямі роднай зямлі, сваёй нацыі.

Зборнікі гістарычнай прозы У. Арлова: “Дзень, калі ўпала страла” (1988), “Рандэву на манеўрах” (1992), “Міласць князя Гераніма” (1993), “Пяць мужчын у леснічоўцы” (1994), “Сны імператара” (2001). Мастацкая канцэпцыя мінулага ў гістарычных аповесцях “Дзень, калі ўпала страла” (1988), “Час чумы” (1990),“Сны імператара” (1991). Ідэйна-мастацкі змест твораў, характарыстыка асноўных вобразаў, сэнс назваў.

Асэнсаванне драматычных падзей вайны з тэўтонамі XIII ст. у аповесці “Дзень, калі ўпала страла”. Праўдзівы паказ У. Арловым вобраза полацкага князя Уладзіміра ў параўнанні з яго выяўленнем у рамане Л. Дайнекі “Меч князя Вячкі”. Сімвалічны вобраз стралы. Сэнс назвы твора.

Аповед пра рымскі перыяд жыцця і творчасці М. Гусоўскага ў аповесці “Час чумы”. Аўтарская канцэпцыя героя і яго подзвігу: “аўтару паэмы наканавана еўрапейская слава”, бо “мастак перадае наступнікам непадлеглы тленню вобраз эпохі і Бацькаўшчыны”. Драматычны вобраз дыпламата Вялікага княства Літоўскага, мецэната мастацтваў, сябра М. Гусоўскага, натхняльніка яго на стварэнне “Песні пра зубра” – Эразма Вітэліуса. Сімвалічны сэнс назвы твора.

Апошнія гады жыцця на востраве святой Алены французскага імператара Напалеона Банапарта ў аповесці "Сны імператара". Успаміны на яве і ў снах пра бясслаўнае выгнанне яго войска з Беларусі. Агонія духу былога імператара. Сімвалічны вобраз "безыменнай жанчыны з віленскай начы", "жанчыны ў белым".

**Творчасць Вольгі Іпатавай** (нар. – 1945 г.).

Шлях у літаратуру. Паэтычныя зборнікі "Раніца" (1969), "Ліпеньскія навальніцы" (1973), "Парасткі" (1976). Зборнікі прозы "Вецер над стромай" (1977), "Дваццаць хвілін з Немезідай" (1981), "Перакат" (1984). Кнігі для дзяцей "Снягурка" (1974), "Казка пра Паўліна" (1983). Кніга "Паміж Масквой і Варшавай" (1996). В. Іпатава – аўтар тэлеп'есы "Давыд Гарадзецкі" (паст. у 1988 г.). Фільм "Гамункулус" (1988, сцэнарысты І. Балгарын і М. Пяцігорская) – экранізацыя яе аповесці "Вузялок Святагора". Песні "Сыну" С. Вяліцкай, "Нёманская сінь" А. Чыркуна, "Аэліта" А. Казбанава і інш. на вершы пісьменніцы.

Зварот В. Іпатавай да гістарычнай тэмы. Працяг Караткевічавай традыцыі рамантызацыі беларускай гісторыі. Займальны сюжэт, жывая форма апавядання як асаблівасці творчай манеры пісьменніцы. Аповесць "Прадслава" (1971) – першы твор на шляху асэнсавання В. Іпатавай нацыянальнай гісторыі. Дакументальнае і мастацкае ў паказе лёсу Еўфрасінні Полацкай. Аповесці "За морам Хвалынскім" (1989), "Чорная княгіня" (1989), "Агонь у жылах крэменю" (1989), "Вяшчун Гедзіміна" (2000), раманы "Залатая жрыца Ашвінаў" (1999), "Альгердава дзіда" (2001) – гістарычная проза В. Іпатавай.

Трылогія "Альгердава дзіда" (2002): аповесць "Вяшчун Гедзіміна", раманы "Залатая жрыца Ашвінаў" і "Альгердава дзіда".

## ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ
## **Сучасная гістарычная проза**

1. Дайце азначэнне паняцця "гістарычная проза" і паразважайце пра яе функцыі (эўрэстычную, аксіялагічную, ідэалагічную).

2. Як у сучасным літаратуразнаўстве асэнсоўваюцца тэндэнцыі развіцця гістарычнай прозы? Якія тэндэнцыі выдзяляюцца А. Дарагакупец, А. Бязлепкінай і С. Андраюком?

3. Раскажыце пра У. Караткевіча як заснавальніка гістарычнай прозы другой паловы XX ст. Назавіце найбольш вядомыя гістарычныя творы пісьменніка. Як У. Караткевіч адносіўся да гісторыі і як пакзваў яе ў сваіх творах?

4. Што дае падставы даследчыкам гаварыць пра наяўнасць у сучаснай

беларускай літаратуры “гістарычнай школы”, заснаванай У. Караткевічам? Хто з пісьменнікаў уваходзіць у гэтую “школу”? Хто з сучасных празаікаў найбольш працягнуў Караткевічаву традыцыю рамантызацыі мінулага?

5. Выявіце асаблівасці асэнсавання гістарычнай тэмы Л. Дайнекам.

5.1 Якія рэальныя падзеі і якіх рэальных дзеючых асоб паказаў пісьменнік у рамане “Меч князя Вячкі”? Хто з герояў пададзены аўтарам у адступе ад гістарычнай праўды і чаму? Якім намаляваў Л. Дайнека князя Вячку? Што дало падставы даследчыкам назваць вобразы захопнікаў (рыжскага епіскапа Альберта і храніста Генрыха) творчай удачай пісьменніка?

5.2 Пра які перыяд беларускай гісторыі апавядае Л. Дайнека ў рамане “След ваўкалака”? Раскрыйце супярэчлівасць вобраза полацкага князя Усяслава Чарадзея. Якія быційныя праблемы трапляюць у поле ўвагі пісьменніка? Растлумачце сэнс назвы твора.

5.3 Які гістарычны час паказаны ў рамане Л. Дайнекі “Жалезныя жалуды”? Якім пададзены ў творы вобраз галоўнага героя – Міндоўга? Выявіце аўтарскія адносіны да заснавальніка Вялікага княства Літоўскага. Акрэсліце ідэю твора. Вызначце мастацкую функцыю Казлейкі і Жэрнаса ў вобразнай сістэме твора. Растлумачце сэнс назвы рамана.

5.4 Як у творах Л. Дайнекі паказана дваяверства нашых продкаў?

5.5 Якія гістарычныя творы Л. Дайнекі будзеце рэкамендаваць для чытання ў 11 класе пры вывучэнні сучаснай літаратуры?

6. Назавіце асноўныя гістарычныя творы У. Арлова.

6.1 На якой гістарычнай постаці засяродзіў пісьменніцкую ўвагу У. Арлоў у аповесці “Дзень, калі ўпала страла”? Параўнайце мастацкую канцэпцыю вобраза полацкага князя Уладзіміра ў аповесці У. Арлова і рамане “Меч князя Вячкі” Л. Дайнекі. Растлумачце назву аповесці.

6.2 Які час і якія постаці беларускай гісторыі і культуры сталі аб'ектам мастацкага даследавання ў аповесці У. Арлова “Час чумы”? Вызначце ідэйны змест твора. Што дапамагло пісьменніку ўзнавіць старонкі жыцця і творчасці Міколы Гусоўскага? Раскрыйце сімвалічны сэнс назвы твора.

6.3 Які перыяд беларускай гісторыі згадваецца ў аповесці У. Арлова “Сны імператара”? Якой гістарычнай асобе прысвечаны твор? Вызначце мастацкую функцыю сімвалічнага вобраза “безыменнай жанчыны з віленскай начы”, “жанчыны ў белым”.

7. Раскажыце пра В. Іпатаву як аўтара гістарычнай прозы і асаблівасці мастацкага ўспрымання пісьменніцай мінулага.

7.1 Вызначце рэальнае і мастацкае ў паказе жыцця Еўфрасінні Полацкай у аповесці “Прадслава”. Які матэрыял твора народжаны творчай фантазіяй пісьменніцы і для чаго ён выкарыстаны? Якія творы, прысвечаныя беларускай асветніцы, вывучаюцца ў школьным курсе літаратуры?

7.2 Зрабіце праблемна-вобразны аналіз аповесці “Вяшчун Гедзіміна”, раманаў “Залатая жрыца Ашвінаў” і “Альгердава дзіда”. Паразважайце, ці на самой справе яны ўтвараюць трылогію?

7.3 Раскажыце пра лёс “залатой жрыцы Ашвінаў”. Які матэрыял у аднайменным рамане трапляе ў поле зроку пісьменніцы акрамя гісторыі сярэднявечнай Беларусі? Чаму па волі аўтара Жывена трапляе ў Візантыю?

8. Якія падзеі беларускай гісторыі асэнсоўваюцца ў раманах Г. Далідовіча “Заходнікі” і Г. Марчука “Крык на хутары”? Ці адносяцца гэтыя творы да сучаснай гістарычнай прозы?

9. Раскажыце пра напрацоўкі пісьменнікаў Берасцейшчыны ў асэнсаванні гістарычнага мінулага. Хто з іх у сваіх творах найбольш актыўна выкарыстоўвае гістарычныя матэрыялы?

***У школьную праграму ўваходзяць наступныя творы*:** аповеды У. Ліпскага “Ад роду – да народу” (з кнігі “Я”) (5 кл.); У. Бутрамеева “Славутая дачка Полацкай зямлі”, апавяданне С. Тарасава “Еўфрасіння Полацкая” (6 кл.); пяты раздзел рамана Л. Дайнекі “Меч князя Вячкі” (7 кл.); раманы “Заходнікі” Г. Далідовіча, “Крык на хутары” Г. Марчука, творы Л. Дайнекі, С. Тарасава (11 кл.).

**Крыніцы**

1. Арлоў, У. Адкуль наш род : Апавяданні па гісторыі Беларусі для мал. школьнікаў / У. Арлоў ; маст. В.П. Сташчанюк. – Мінск : ВЦ “Бацькаўшчына”, 1996. – 106 с.

2. Арлоў, У. Еўфрасіння Полацкая = Евфросиния Полоцкая / У. Арлоў. – Мінск : Маст. літ., 1992. – 220 с. – (Святыя зямлі беларускай). – На бел. і рус. мовах.

3. Арлоў, У. Мой радавод да пятага калена : Эсэ / У. Арлоў. – Мінск : ВЦ “Бацькаўшчына”, 1993. – 184 с.

4. Арлоў, У. Сны імператара : Апавяданні. Аповесці. Эсэ / У. Арлоў. – Мінск : Маст. літ., 2001. – 382 с. – (Беларуская проза ХХ ст.).

5. Арлоў, У. Міласць князя Гераніма : Аповесці. Апавяданні / У. Арлоў ; маст. П. Драчоў. – Мінск : Юнацтва, 1993. – 272 с. – (Школьная бібліятэка).

6. Арлоў, У. Пяць мужчын у леснічоўцы : Аповесці, апавяданні, эсэ / У. Арлоў. – Мінск : Маст. літ., 1994. – 366 с. – (З вякоў мінулых).

7. Арлоў, У. Рандэву на манеўрах : Аповесць. Апавяданні / У. Арлоў. – Мінск : Маст. літ., 1992. – 270 с. – (З вякоў мінулых).

8. Арлоў, У. Таямніцы Полацкай гісторыі / У. Арлоў. – 2-е выд., дапрац. – Мінск : Полымя, 2002. – 463 с.

9. Арлоў, У. Час чумы : гіст. аповесці. Апавяданні / У. Арлоў. – Мінск : Логвінаў, 2005.

10. Дайнека, Л. Жалезныя жалуды : раман / Л. Дайнека ; маст. А. Кажаноўскі. – Мінск : Юнацтва, 1993. – 301 с.

11. Дайнека, Л. Меч князя Вячкі : раман / Л. Дайнека. – Мінск : Маст. літ., 2006. – 318 с.

12. Дайнека, Л. Назаві сына Канстанцінам : раман / Л. Дайнека. – Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2010. – 447 с. – (Святло мінуўшчыны).

13. Дайнека, Л. След ваўкалака : раман / Л. Дайнека // Меч князя Вячкі. След ваўкалака / Л. Дайнека. – Мінск : Юнацтва, 1993. – С. 299–605.

14. Далідовіч, Г. Заходнікі : раман / Г. Далідовіч ; маст. М. Чуднікаў. – Мінск : Юнацтва, 1994. – 237 с., іл.

15. Далідовіч, Г. Кліч роднага звона : раман-хроніка / Г. Далідовіч ; маст. М. Каханоўскі. – Мінск : Юнацтва, 2000. – 382 с.

16. Дудзюк, З. Велясіты : раман / З. Дудзюк // Маладосць. – 2005. – № 2. – С. 18–87 ; № 3. – С. 5–23 ; № 4. – С. 110–132.

17. Дудзюк, З. Год 1812 : раман / З. Дудзюк. – Брэст : Академия, 2004. – 312 с.

18. Дудзюк, З. Славянскія князі : аповесць-хранограф / З. Дудзюк // Полымя. – 2005. – № 10. – С. 12–57.

19. Лойка, А. Францыск Скарына, або Сонца Маладзіковае : раман-эсэ / А. Лойка. – Мінск : Маст. літ., 2009. – 366 с. – (Школьная бібліятэка).

20. Конеў, Я. Глеб Менскі : аповесць / Я. Конеў // Маладосць. – 2005. – № 7. – С. 8–30 ; № 8. – С. 5–35.

21. Наварыч, А. Літоўскі воўк : гіст. раман / А. Наварыч. – Мінск : Маст. літ., 2005. – 285 с. – (Беларуская проза XXI стагоддзя).

22. Рублеўская, Л.І. Ночы на Плябанскіх млынах : раман, аповесць, апавяданні / Л. Рублеўская. – Мінск : Маст. літ., 2013. – 526 с.

23. Рублеўская, Л. Пярсцёнак апошняга імператара : раман, аповесць, апавяданні / Л. Рублеўская. – Мінск : Маст. літ., 2005. – 279 с. – (Сучасны беларускі дэтэктыў).

24. Рублеўская, Л. Сутарэнні Ромула : раманы / Л. Рублеўская. – Мінск : Кнігазбор, 2012. – 519 с. – (Кнігарня пісьменніка. Вып. 26.).

25. Рублеўская, Л. Сэрца мармуровага анёла : аповесці, раман / Л. Рублеўская. – Мінск : Маст. літ., 2012. – 348 с.

26. Чаропка, В. Храм без Бога : раман / В. Чаропка ; прадм. К. Тарасава. – Мінск : Маст. літ., 1992. – 262 с.

27. Ялугін, Э. Ідзі і кажы : гістар. раман / Э. Ялугін // Полымя. – 2006. – № 1. – С. 3–55 ; № 2. – С. 3–34.

**Літаратура**

1. Бязлепкіна, А. Гістарычная проза / А. Бязлепкіна // 100 слоў пра сучасную беларускую літаратуру / А. Бязлепкіна. – Мінск : Лімарыус, 2012. – С. 53–54.

2. Дарагакупец, А. Тэндэнцыі рамантызацыі і інтэлектуалізацыі ў сучаснай беларускай гістарычнай прозе / А. Дарагакупец. – Мінск, 2005.

3. Локун, В. Вяртанне да Бацькаўшчыны / В. Локун // Кругі жыцця – кругі літаратуры / В. Локун. – Мінск, 2002. – С.181–189.

4. Макмілін, А. Уладзімер Арлоў – першапраходца ў беларускай гістарычнай літаратуры. Некаторыя іншыя аўтары гістарычнай прозы // Пісьменства ў халодным клімаце. Беларуская літаратура ад 70-х гг. XX ст. да нашых дзён / А. Макмілін. – С. 493–545.

5. Савік, Л. Адна між замкаў : Літаратурны партрэт Вольгі Іпатавай / Л. Савік. – Мінск : БелСаЭс “Чарнобыль”, 2003. – 166 с.

6. Шынкарэнка, В. Леанід Дайнека / В. Шынкарэнка // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. Т. 4. Кн. 2. 1986–2000 / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы ; навук. рэд. У. Гніламёдаў, С. Лаўшук. – Мінск : Беларус. навука, 2003. – С. 466–494.

7. Шынкарэнка, В. Нястомных пошукаў дарога : Праблемы паэтыкі сучаснай беларускай гістарычнай прозы / В. Шынкарэнка ; УА “Гомельскі дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны”. – Мінск : Беларус. навука, 2002. – 207 с.

8. Шынкарэнка, В. Станаўленне і развіццё беларускай прозы пра мінулае / В. Шынкарэнка // Весці НАН Беларусі. Серыя гуманіт. навук. – 2003. – № 1. – С. 92–96.

**Дадатковая літаратура**

1. Андраюк, С. Проза / С. Андраюк // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. Т. 4. Кн. 2. 1986–2000 / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы ; навук. рэд. У. Гніламёдаў, С. Лаўшук. – Мінск : Беларус. навука, 2003. – С. 30–31.

2. Арлоў Уладзімір // Беларускія пісьменнікі : Біябібліягр. слоўн. : у 6 т. / Ін-т літ. імя Я. Купалы ; рэдкал.: І. Багдановіч [і інш.]. – Мінск : “Беларус. энцыкл.”, 1992–1995. – Т. 1 : Абуховіч – Ватацы. – 1992. – С. 95.

3. Бугаёў, Дз. Гіст. проза А. Наварыча ў святле караткевічаўскай традыцыі / Дз. Бугаёў // Полымя. – 2006. – № 3. – С. 162–167.

4. Бут-Гусаім, С. Нацыянальна-культурная адметнасць антрапанімі-кону гістарычнай прозы берасцейскіх пісьменнікаў / С. Бут-Гусаім // Веснік Брэсцкага універсітэта. Серыя 3. Філалогія, педагогіка, псіхалогія. – 2013. – № 2. – С. 5–14.

5. Грамадчанка, Т. Калі ў храме служаць фарысеі… / Т. Грамадчанка // Роднае слова. – 2006. – № 1. – С. 36–40 [пра раман “Храм без Бога” В. Чаропкі].

6. Дайнека, Л. Быць зямлі сваёй сынам / Л. Дайнека ; гут. В. Шынкарэнка // Літаратура і мастацтва. – 2002. – 25 кастр. – С. 5.

7. Дайнека Леанід // Беларускія пісьменнікі : Біябібліягр. слоўн. : у 6 т. / Ін-т літ. імя Я. Купалы ; рэдкал.: І. Багдановіч [і інш.]. – Мінск : “Беларус. энцыкл.”, 1992–1995. – Т. 2 : Верабей – Іваноў. – 1993. – С. 312–315.

8. Дайнека, Л. Слова на дарогу / Л. Дайнека // Меч князя Вячкі. След ваўкалака : раманы / Л. Дайнека. – Мінск : Юнацтва, 1993. – С. 3–6.

9. Дамарад, І. Сустрэча на шляхах гісторыі / І. Дамарад // Літаратура і мастацтва. – 2005. – 2 сн. – С. 6.

10. Іпатава Вольга // Беларускія пісьменнікі : Біябібліягр. слоўн. : у 6 т. / Ін-т літ. імя Я. Купалы ; рэдкал.: І. Багдановіч [і інш.]. – Мінск : “Беларус. энцыкл.”, 1992–1995. – Т. 3 : Івашын – Кучар. – 1994. – С. 19–23.

11. Кабржыцкая, Т. Зорка – слова жаночага роду! Назіранні над асаблівасцямі гістарычнай прозы Л. Рублеўскай / Т. Кабржыцкая // Полымя. – 2013. – № 7. – С. 128–134.

12. Кірушкіна, М. Мастацкія адметнасці гістарычнай прозы В. Іпатавай / М. Кірушкіна // Роднае слова. – 2013. – № 7. – С. 26–28.

13. Кушнер, В. Твой поспех у тваіх руках, Вітаўт! / В. Кушнер // Беларускі гіст. часопіс. – 2006. – № 8. – С. 30–31 [жыццёвы і творчы шлях В. Чаропкі].

14. Лата-Загорскі, А. Чытаць і перачытваць / А. Лата-Загорскі // Роднае слова. – 2006. – № 11. – С. 5–7 [гістар. тэма ў творчасці Э. Ялугіна].

15. Леанід Дайнека ; Падр. М. Шамякіна // Полымя. – 2007. – № 1. – С. 157–160.

16. Лысова, Н. Гістарычная проза Людмілы Рублеўскай : да характарыстыкі жанру / Н. Лысова // Вестник Полоцкого гос. ун-та. Серия А. Гуманит. науки. – 2013. – № 10. – С. 12–17.

17. Рубінава, Л. Сны Вітаўта, або Тэатр аднаго гісторыка / Л. Рубінава // Беларусь. – 2006. – № 9. – С. 36–37 [пра творчасць В. Чаропкі. Па матэрыялах гутаркі з ім].

18. Тарасаў, К. Вітражы для храма памяці / К. Тарасаў // Храм без Бога : раман / В. Чаропка ; прадм. К. Тарасава. – Мінск : Маст. літ., 1992. – С. 3–4.

## СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ПАЭЗІЯ

Творчыя пакаленні сучаснай беларускай паэзіі. М. Танк, П. Панчанка як паэты старэйшага пакалення. Асаблівасці іх творчасці апошняга перыяду жыцця. Матывы спавядальнасці, самапакаяння. Творчасць паэтаў-“шасцідзесятнікаў” (Н. Гілевіча, Р. Барадуліна, А. Вярцінскага, В. Зуёнка, інш.). Пакаленне, народжанае ў цяжкія пасляваенныя гады (С. Законнікаў, А. Разанаў, Н. Мацяш, В. Жуковіч, інш.). Паэты, творчасць якіх пачалася ў 70–80-я гады (Л. Дранько-Майсюк, Л. Рублеўская, Э. Акулін, інш.). Прыход у літаратуру другой паловы 80-х – пачатку 90-х гадоў новага пакалення паэтаў.

Сучасная паэзія ў спазнанні сутнасці часу, быцця, свету. Мадэрнізацыя паэтычнай свядомасці. Найбольш значныя кнігі сучаснай паэзіі, іх уплыў на літаратурны працэс. Тэндэнцыя на захаванне ў паэзіі высокай змястоўнасці праз глыбокія праекцыі ў памяць, у гістарычныя аналогіі, праз шматзначнасць асацыятыўных супастаўленняў і паралеляў. Адначасова відавочнасць інерцыі часоў застою, узмацненне наплыву другаснасці ў вершатворчасць.

Праблема традыцый і наватарства ў паэзіі. Жанравая разнастайнасць беларускай паэзіі. Паяднанне публіцыстычнага, філасофскага і інтымна-псіхалагічнага пачаткаў у сучаснай лірыцы (П. Панчанка, Н. Гілевіч, С. Грахоўскі, інш.). Набыткі ў галіне паэтычных жанраў (вершаказы, пункціры, танка, хоку, санеты, рубаі, актавы, і г.д.).

Эстэтычна-стылёвыя плыні ў сучаснай беларускай паэзіі: лірыка-апавядальная, рамантычная, публіцыстычная, філасофска-аналітычная, мастацка-сінкрэтычная, універсальна-інтэлектуальная.

Тэматычная разнастайнасць паэзіі: тэмы Бацькаўшчыны, роднай мовы, гістарычнага мінулага, прыроды, экалогіі, чарнобыльскай трагедыі, працы, кахання. Біблейска-філасофскія і рэлігійна-хрысціянскія матывы ў творчасці М. Танка, В. Зуёнка, Р. Барадуліна, інш. Традыцыя філасафізму і яе ўплыў на сучасную паэзію. Інтэлектуалізацыя мастацкага мыслення. Спалучэнне асабістага і грамадскага ў паэзіі В. Зуёнка, погляд паэта на эпоху і час, публіцыстычны пафас творчасці. Асэнсаванне надзённых праблем, драматызм светабачання ў кнігах “Лета трывожных дажджоў” (1990), “Чорная лесвіца” (1992). Аналітызм аўтарскай думкі. Разнастайнасць паэтычных рытмаў, інтанацый.

Сучасная паэтычная міфатворчасць. Тыпалагізацыя матываў, сувязь з фальклорнай і біблейскай традыцыяй. Вобразы беларускаіі міфалогіі ў творах М. Танка, Р. Барадуліна, А. Мінкіна, А. Сыса, інш.

М. Багдановіч і развіццё гістарычнай тэмы сучаснай літаратуры. Гераічнае і трагічнае ў сучаснай паэзіі пра беларускае мінулае (балады, вершы У. Караткевіча, М. Арочкі, А. Лойкі, Т. Бондар, А. Пісьмянкова і інш.). Адлюстраванне гістарычнага лёсу славян у кнізе Я. Сіпакова “Веча славянскіх балад”, жанравая спецыфіка твораў паэта. Кніга “Быў. Ёсць. Буду” У. Караткевіча. Патрыятычны пафас, асноўныя вобразы і матывы, адметнасць паэтычнага стылю.

Прыродацэнтрызм як аснова мыслення сучасных паэтаў. Драматызм вершаў на экалагічную тэматыку.

М. Мятліцкі як летапісец чарнобыльскай трагедыі. Пафас і вобразны свет кніг “Горкі вырай” (1989), “Палескі смутак” (1991), “Бабчын” (1996), “Хойніцкі сшытак” (1999), “Замкнёны дом” (2005). Паэтычныя маналогі, элегіі, балады, пасланні і інш. Партрэты землякоў-бабчынцаў. Матывы і міфалагемы нядолі, гора, бяды, ліха, смерці. Паэтыка чарнобыльскага пейзажу.

Багацце духоўнага зместу ў лірыцы кахання Я. Янішчыц, Р. Баравіковай, Н. Мацяш, Г. Бураўкіна, інш. Наватарства ў галіне вершаванай формы і іншыя мастацкія пошукі сучаснай паэзіі. Лірыка Л. Дранько-Майсюка ў кантэксце эстэтыкі імпрэсіянізму. Адкрыццё паэзіі ў прозе жыцця (зборнік “Вандроўнік”, 1983). Паэтызацыя роднага Палесся (“Тут, у палескай глыбі...”, “Цягне мяне сюды...” і інш.). Бліскучыя вобразныя знаходкі і эстэтычна яркія асацыяцыі. Прыгажосць паэтычнай выяўленчасці (арфейная ўзнёсласць, мілагучнасць слова і інш.). Прынцыпы красы, эстэтызму ў зборніках Л. Дранько-Майсюка “Над пляцам” (1986), “Тут” (1990), “Акропаль” (1994), “Стомленасць Парыжам” (1995). Рэцэпцыя антычнай культуры. Л. Дранько-Майсюк як пясняр кахання (цыкл “Вершы для А.”).

Беларуская паэма на сучасным этапе: жанравая сінтэтычнасць, разнастайнасць мастацкіх формаў, інш. Выяўленне розных аспектаў чалавечага быцця: маральнага, сацыяльнага, гістарычнага, рэлігійнага і інш. Мастацкія дакументы часу перабудовы (“Паэма сораму і гневу” П. Панчанкі, інш.). Асэнсаванне чарнобыльскай трагедыі ў сучасным паэтычным эпасе. Эмацыянальна-псіхалагічная змястоўнасць і публіцыстычнасць паэмы С. Законнікава “Чорная быль”. Паэмы ў прозе Я. Сіпакова: “Одзіум”, “Хата”, “Ахвярны двор” і інш. “Падарожжа вакол двара” – заключная паэма з ліра-эпічнага цыкла В. Зуёнка “Пяцірэчча”.

Драматызацыя паэмнага жанру: творы М. Арочкі, Р. Баравіковай, Л. Рублеўскай, інш. Інтэлектуальная заглыбленасць думкі ў паэмных творах А. Разанава (“Гліна”, “Усяслаў Чарадзей” і інш.). Лірыка-маналагічны характар асобных сучасных паэм. Мадэрнізацыя беларускай паэмы як вынік эстэтычнай рухомасці жанру, актывізацыі асацыятыўнага тыпу мыслення.

***У школьную праграму ўваходзяць наступныя творы:*** вершы А. Грачаннікава “Дрымотна ціснуцца кусты…”, “Зоры спяваюць”, “Верасень”, “Як ападае ліст…”, В. Зуёнка “Прыйдзі аднойчы…”, С. Грахоўскага “Мама” (5 кл.); А. Пісьмянкова “Продкі”, Я. Крупенькі “Ёсць у кожнага з нас…”, К. Камейшы “Камень ля вёскі Камень”, А. Ставера “Жураўлі на Палессе ляцяць”, Г. Бураўкіна “Малітва”, А. Бачылы “Радзіма мая дарагая”, А. Вялюгіна “Спелы бор”, урывак з прадмовы “Бібліі” ў паэтычным узнаўленні А. Разанава (6 кл.); вершы Л. Галубовіча “Паэзія”, Д. Бітэль “Роднае слова”, А. Вярцінскага “Рэквіем па кожным чацвёртым”, В. Зуёнка “Я са шляхоў далёкіх…” (7 кл.); А. Вярцінскага “Жыццё даецца, каб жыццё тварыць”, А. Грачаннікава “Свяці, кахання чыстая зара…” (8 кл.); Я. Янішчыц “Чаму ніколі не баюся я…”, “Не воблака, а проста аблачынка…”, “Помню, помню праз гады…”, “Любоў мая…” (верш на памяць), паэма А. Вярцінскага “Песня пра хлеб” (11 кл.).

### Асноўная літаратура

1. Бельскі, А. Свет ад травы да зор : беларуская паэзія : сістэма вобразаў прыроды, паэтыка пейзажу : дапам. для наст. / А. Бельскі. – Мінск : Народ. асвета, 1998. – 221 с.

2. Гніламёдаў, У. Ад даўніны да сучаснасці : Нарыс пра беларускую паэзію / У. Гніламёдаў. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – 246 с.

3. Гніламёдаў, У. На мяжы часоў : нататкі пра сучасную паэзію / У. Гніламёдаў // Полымя. – 2013. – № 12. – С. 108–119.

4. Гниломёдов, В. На рубеже времён : русскоязычная поэзия Беларуси. – Минск : Галіяфы, 2013. – 175 с.

5. Калядка, С. Беларуская сучасная жаночая паэзія : мастацкія канцэпцыі "жаночага шчасця" : манаграфія / С. Калядка ; НАН Беларусі, Ін-т мовы і літаратуры. – Мінск : Беларус. навука, 2010. – 163 с.

6. Макмілін, А. Паэзія // Пісьменства ў халодным клімаце. Беларуская літаратура ад 70-х гг. XX ст. да нашых дзён / А. Макмілін. – С. 309–429.

7. Тарасюк, Л. Апалогія красы : Кніга пра беларускую паэзію / Л. Тарасюк. – Мінск : Права і эканоміка, 2003. – 140 с.

### Дадатковая літаратура

1. Бязлепкіна, А. Жаночая паэзія / А. Бязлепкіна // 100 слоў пра сучасную беларускую літаратуру / А. Бязлепкіна. – Мінск : Лімарыус, 2012. – С. 65–66.

2. Бязлепкіна, А. Паэзія / А. Бязлепкіна // 100 слоў пра сучасную беларускую літ-ру / А. Бязлепкіна. – Мінск : Лімарыус, 2012. – С. 123–126.

3. Гальпяровіч, Н. "Вернасць роднаму слову, вернасць роднай зямлі" : інтэрв'ю з паэтам Навумам Гальпяровічам / Н. Гальпяровіч ; гутар. Зоя Падліпская // Роднае слова. – 2013. – № 5. – С. 16–19.

4. Дубоўская, Т. "Der Mond Denkt, die Sonne sinnt: Wordichte", або Ментальна-нацыянальныя вобразы ў вершасловах А. Разанава / Т. Дубоўская // Полымя. – 2013. – № 12. – С. 92–99.

5. Киселёв, Г. И божество, и вдохновенье! / Г. Киселёв // Нёман. – 2013. – № 6. – С. 159–185 [паэтычныя кнігі сучасных беларускіх паэтаў].

6. Мельнікава, З.П. Духоўна-светапогляднае вызначэнне асобы і паэзія Зьніча (Алега Бембеля) / З.П. Мельнікава // Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. Серыя 3. Філалогія, педагогіка, псіхалогія. – 2013. – № 2. – С. 60–66.

7. Санюк, Дз. Алесь Разанаў і дэкаданс / Дз. Санюк // Маладосць. – 2013. – № 1. – С. 88–92.

## ТВОРЧАСЦЬ РЫГОРА БАРАДУЛІНА (1935–2014).

Асоба народнага паэта Беларусі (1992) Р. Барадуліна ў кантэксце нацыянальнай літаратуры. Арганічнасць яго таленту: лірык, публіцыст, эсэіст, дасведчаны крытык. Актыўны ўдзел паэта ў грамадска-асветным жыцці краіны.

Высокае прызнанне таленту мастака: лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Я. Купалы (1976) за зборнік “Рум” і пераклады з Фэдэрыка Гарсіі Лёркі, прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1976), узнагарода ордэнам Дружбы народаў, ордэнам Знак Пашаны, латышскім ордэнам Трох Зорак (званне Афіцэра ордэна (4 ступень) (1997), медалём Францыска Скарыны, інш. Ганаровы доктар БДУ і ганаровы грамадзянін Ушацкага раёна. Намінант на Нобелеўскую прэмію ў галіне літаратуры (2006) за зборнік “Ксты”.

Звесткі з біяграфіі. Родная Ушаччына як крыніца натхнення мастака. Крэўная, трывалая духоўная еднасць з зямлёй бацькоў. Вайна ў лёсе паэта. Нялёгкая доля бязбацькавіча. Маці Акуліна Андрэеўна ў жыцці і творчасці Р. Барадуліна.

Першыя вершы (1953) за подпісам Алесь Чабор. Прысуджэнне маладому паэту сярэбранага медаля VI Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў за нізку вершаў “На зямлі цаліннай”. Першы зборнік “Маладзік над стэпам” (1959) як прыкметная эстэтычная з’ява ў тагачаснай паэзіі. Яго ацэнка ў крытыцы. Зборнікі “Рунець, красавань, налівацца!” (1961), “Нагбом” (1963), “Неруш” (1966), “Адам і Ева” (1968) і інш. Інтэнсіўнае развіццё творчай індывідуальнасці паэта, яго наватарства. Самабытнасць яго паэтычнага голасу сярод творцаў “новай хвалі”. Адмаўленне агульшчыны і гладкапісу, паглыбленне лірыка-інтымнага і філасофскага свету беларускага верша, абнаўленне формаў і прыёмаў версіфікацыі. Актывізацыя грамадзянскай думкі паэта, арыентацыя на гуманістычныя ідэалы. Трывога Р. Барадуліна пра нацыянальныя духоўныя каштоўнасці (“Неруш” і інш.).

Творчая актыўнасць мастака на працягу дзесяцігоддзяў. Багацце і разнастайнасць творчых набыткаў. Паэтычны плён: кнігі “Рум” (1974), “Абсяг” (1978), “Вечалле” (1980), “Амплітуда смеласці” (1983), “Маўчанне перуна” (1986), “Самота паломніцтва” (1990), “Міласэрнасць плахі” (1992), “Евангелле ад Мамы” (1995), “Босая зорка” (2001), інш. Барадулінаўскія пасланні ў кнігах “Лісты ў Хельсінкі” (2000), “Калі рукаюцца душы...” (2003).

Разнастайнасць жанрава-стылёвых формаў у творчасці Р. Барадуліна: верлібр, акрасанет, пацеры, навела, лера-паэма, інш.

Асноўныя тэмы і матывы паэзіі Р. Барадуліна. Беларуская вёска падчас акупацыі, блакадная рэчаіснасць, дзяцінства, абпаленае вайной, у адлюстраванні паэта. Драматызм дзіцячага свету ў паэмах “Трыпціх”, “Блакада”, вершах “Бацьку”, “Палата мінёраў”, “Стэарынавая свечка”, “Хлебнічак”, інш. Антываенная скіраванасць твораў.

Радзіма як вечная і непераходная каштоўнасць быцця ў творчасці Р. Барадуліна. Культ роднага кутка, прылучэнне да першаасноў духоўнага існавання (“Трэба дома бываць часцей”, інш.). Паэтызацыя вяскова- сялянскага побыту, беларускага ладу жыцця. Духоўная спадчына, культура роднага краю,

народнае слова ў паэтычным свеце Р. Барадуліна. Яго імкненне зберагчы моўна-этнічную, генную памяць народа.

Вобраз маці, адзін з цэнтральных у творчасці паэта, як духоўны цэнтр нацыянальнага свету. Выяўленне інтымна-шчырых, глыбінна-чалавечых пачуццяў у творах пра маці. Біблейскія матывы пакаяння і просьбы аб дараванні ў кнізе "Евангелле ад Мамы". Матчын вобраз як сімвал абагаўлення і прычашчэння.

Глыбокая лучнасць душы паэта з прыродай роднага краю, выяўленне пачуццяў любові і замілавання. Вобразная яркасць і сакавітасць прыродаапісанняў, жывапіснасць аўтарскага стылю. Міфапаэтычнае ўспрыманне паэтам рэчаіснасці, адухаўленне прыродных з'яў і стыхій. Экзатычныя краявіды ў паэзіі Р. Барадуліна. Выяўленне патрыятызму праз антытэзу "роднае – чужое".

Канцэпт кахання ў паэзіі Р. Барадуліна. Тонкі лірызм, эмацыянальная экспрэсіўнасць у выяўленні інтымных пачуццяў. Краса кахання і музыка слова ў вершах паэта. Узнёслае і светлае, драматычнае і балючае ў творах на любоўную тэматыку.

Трагізм твораў Р. Барадуліна пра Чарнобыль. Матывы смутку, жальбы, смяротнай пагрозы ў кнігах "Самота паломніцтва" (1990) і "Міласэрнасць плахі" (1992). Публіцыстычна завостраныя пытанні і малітоўныя інтанацыі ў чарнобыльскіх вершах. Выкарыстанне прыёму ідэйна-сэнсавага кантрасту. Рэлігійна-духоўныя і маральна-філасофскія шуканні паэта. Біблейскія, хрысціянска-гуманістычныя матывы. Паэтычныя малітвы і псалмы. Эстэтычная адметнасць кнігі "Ксты" (2005). Скіраванасць думак-памкненняў паэта да Бога.

Феномен паэтычнага майстэрства Р. Барадуліна. Віртуознае валоданне словам, гукапіснымі сродкамі мовы. Суб'ектыўная непаўторнасць вобраза, эстэтыка-семантычная выяўленчасць барадулінскага слова. Багацце метафар, маляўнічасць эпітэтаў. Спалучэнне ў метафары канкрэтна-пачуццёвага і асацыятыўнага пачаткаў. Паэтыка гуку ў мастацкай сістэме Р. Барадуліна. Майстэрства паэта ў галіне словатворчасці.

Шматграннасць літаратурнай дзейнасці пісьменніка. Далучанасць да еўрапейскай і сусветнай літаратуры. Р. Барадулін як перакладчык і папулярызатар творчасці замежных паэтаў. Выданне на беларускай мове кніг Амара Хаяма, Яна Райніса, Федэрыка Гарсія Лоркі, Габрыэлы Містраль, Барыса Пастарнака, Стэфана Паптонева, Івана Драча, інш. Кнігі перакладаў "Кахаць – гэта значыць..." (1986), "Беларусь мяне збеларушвае" (1993).
Р. Барадулін як дзіцячы пісьменнік: зборнік выбраных твораў для дзяцей "Ішоў Коця па канапе" (1997), "Як воўк каледаваў" (2000), інш.

Творчыя здабыткі паэта ў галіне гумару і сатыры: кнігі "Дойны конь" (1965), "Станцыя кальцавання" (1971), "Журавінка" (1973), "Прынамсі" (1977), "Мудрэц са ступаю" (1988), інш. Зварот да народнага гумару, смешныя гісторыі

і анекдоты, гарэзлівыя жарты-кпіны, перасмешкі ў барадулінскіх эпіграмах і шаржах. Гулліва-смехавая стыхія ў паэме "Смаргонская акадэмія" (1975).

ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ
**Самабытны талент Рыгора Барадуліна**

1. Выявіце факты біяграфіі Р. Барадуліна, якія спрыялі яго станаўленню як беларускага пісьменніка.

1.1 Падбярыце матэрыял "Штрыхі да партрэта пісьменніка".

2. Вершаваны калейдаскоп. Прачытайце вершы паэта, якія найбольш уразілі.

3. Абмеркаванне пытанняў:

3.1 Раскажыце пра прыход Р. Барадуліна ў літаратуру. Што дало падставы даследчыкам разглядаць першы зборнік паэта "Маладзік над стэпам" як прыкметную эстэтычную з'яву ў тагачаснай паэзіі?

3.2 Да якой мастацка-стылёвай плыні сучаснай беларускай паэзіі і на якой падставе адносіць У. Гніламёдаў паэзію Р. Барадуліна?

3.3 Акрэсліце тэматычны дыяпазон і жанравую разнастайнасць твораў паэта.

3.4 Вызначце месца твораў ваеннай тэматыкі ў творчасці Р. Барадуліна (паэмы "Трыпціх", "Блакада", вершы "Бацьку", "Палата мінёраў", "Стэарынавая свечка", "Хлебнічак", інш.). Пакажыце канкрэтна- рэалістычныя вобразы і дэталі, якімі аўтар ўвасабляе трагедыю вайны.

3.5 Раскрыйце паводле барадулінаўскіх вершаў і паэмаў свет Радзімы мастака. Якія асаблівыя абрысы гэты свет набывае ў параўнанні з іншымі паэтамі? Раскажыце пра выяўленне Р. Барадуліным пачуцця любові да зямлі бацькоў, паэтызацыю вяскова-сялянскага побыту, беларускага ладу жыцця, духоўнай спадчыны, культуры роднага краю, народнага слова. Прасачыце народна-фальклорныя вытокі паэтычнага мыслення Р. Барадуліна.

3.6 Паразважайце пра вобраз маці як адзін з цэнтральных у творчасці мастака (паэма "Куліна", вершы "Веды", "Вогнепаклонніца", "Не ведаючы тэорыі вольных вершаў...", інш.). Якія новыя аспекты ў раскрыцці дарагога вобраза выявіў паэт у кнізе "Евангелле ад Мамы"?

3.7 Пакажыце паэтызацыю хараства роднай прыроды ў творах паэта. Якія мастацкія сродкі выкарыстоўвае мастак для дасягнення вобразнай яркасці і маляўнічасці пейзажных малюнкаў? Якімі ў паэзіі Р. Барадуліна паўстаюць экзатычныя краявіды?

3.8 Якія матывы і інтанацыі вызначаюць кнігі "Самота паломніцтва" і "Міласэрнасць плахі"? Раскрыйце сімвалічны сэнс іх назваў.

3.9 Што вызначае лірыку кахання Р. Барадуліна?

3.10 Раскрыйце маральна-філасофскія і духоўна-рэлігійныя шуканні паэта апошніх дзесяцігоддзяў творчасці. Вызначце эстэтычную адметнасць кнігі Р. Барадуліна “Ксты”.

3.11 Раскажыце пра творчыя здабыткі паэта ў галіне сатыры і гумару. Ахарактарызуйце смехавую стыхію ў паэме “Смаргонская акадэмія”.

3.12 Раскрыйце асаблівасці паэтычнага майстэрства Р. Барадуліна (арыгінальная метафарычна-асацыятыўная вобразнасць, гукапіс, рытміка, рыфма, словатворчасць). Падбярыце вершы, якія найбольш выяўляюць гэтыя асаблівасці.

4. Падрыхтуйце паведамленні “Рыгор Барадулін як перакладчык і папулярызатар творчасці замежных паэтаў”, “Рыгор Барадулін як аўтар кніг для дзяцей”.

5. Падрыхтуйце верш Р. Барадуліна на памяць.

***Для вывучэння ў школе выносяцца наступныя вершы Р. Барадуліна:*** “Бацьку” (на памяць) (5 кл.); “Уцякла зіма ад вясны” (6 кл.); “Мы – беларусы” (на памяць) (7 кл.); “Трэба дома бываць часцей” (на памяць) (8 кл.); “Неруш”, “Яна адна, зямля бацькоў...”, “Заспаная раніца мжыстая...”, “Пакуль жывеш, развітвайся з жыццём...”, “Божа, паспагадай усім...” (11 кл.).

**ТВОРЫ апошняга дзесяцігоддзя**:

1. Барадулін, Р. Збор твораў : у 5 т. / Р. Барадулін ; прадм. В. Сёмухі. – Мінск : Маст. літ., 1996–2003.

2. Барадулін, Р. Аратай, які пасвіць аблокі : Сябр. слова, эсэ і неканізаваныя ўспаміны / Р. Барадулін ; маст. М. Казлоў. – Мінск : Маст. літ., 1995. – 350 с.

3. Барадулін, Р. Босая зорка : Паэзія / Р. Барадулін ; маст. Г. Грак. – Мінск : ГА БТ “Кніга”, 2001.- 173 с.

4. Барадулін, Р. Евангелле ад Мамы : Кн. паэзіі / Р. Барадулін. – Мінск : Маст. літ., 1995. – 462 с.

5. Барадулін, Р. Ксты / Р. Барадулін ; выд. 2-е, дап. – Мінск : Рымска-каталіцкая парафія святога Сымона і святой Алены, 2006.

6. Барадулін, Р. Лісты ў Хельсінкі : Вершы / Р. Барадулін. – Мінск : МГА “Беларус. кнігазбор”, 2000. – 81 с.

7. Барадулін, Р. Руны Перуновы : Выбр. творы / Р. Барадулін ; уклад. А. Камоцкі і У. Сіўчанкаў, прадм. У. Някляева ; маст. А. Кашкурэвіч. – Мінск : Радыёла-плюс, 2006.

8. Барадулін, Р. Слаўлю чысты абрус : Выбранае / Р. Барадулін ; прадм. А. Астраух. – Мінск : Беларусь, 1996. – 271 с.

9. Барадулін, Р. Трэба дома бываць часцей... : Выбр. старонкі лірыкі / Р. Барадулін ; прадм. В. Быкава. – Мінск : Маст. літ., 1993. – 352 с.

## Асноўная літаратура

1. Арочка, М. Рыгор Барадулін / М. Арочка // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – 2-е выд. – Мінск : Беларус. навука, 2001–2002. – Т. 4. – Кн. 1. – 2002. – С. 594–619.

2. Барадулін Рыгор // Беларускія пісьменнікі : Біябібліягр. слоўн. : у 6 т. / Ін-т літ. імя Я. Купалы ; рэдкал. : І. Багдановіч [і інш.]. – Мінск : "Беларус. энцыкл.", 1992–1995. – Т. 1. : Абуховіч – Ватацы. – 1992. – С. 210–235.

3. Гарэлік, Л. Зямля дала мне права : Станаўленне творчай індывідуальнасці Рыгора Барадуліна / Л. Гарэлік. – Мінск, 1983.

4. Макмілін, А. Рыгор Барадулін : паэт на ўсе часы // Пісьменства ў халодным клімаце. Беларуская літаратура ад 70-х гг. XX ст. да нашых дзён / А. Макмілін. – С. 92–126.

## Дадатковая літаратура

1. Астраух, А. "Долі інакшай не трэба зямной..." : Нататкі пра паэзію / А. Астраух // Роднае слова. – 2000. – № 12. – С. 15–18.

2. Астраух, А. "Каб хатнім стаў неспасціжны свет" : Маст. прырода народна-быційнага ў паэзіі Р. Барадуліна / А. Астраух // Маладосць. – 2000. – № 9. – С. 235–241.

3. Астраух, А. Рыгор Барадулін і сучасная беларуская лірыка : Вучэб.-метад. дапам. па аднайменным спецкурсе для спец. Г.02.01.00 "Бел. мова і літ." / А. Астраух. – Гродна : ГрДУ, 2001. – 120 с.

4. Бельскі, А. Магія радка / А. Бельскі // Краса і смутак / А. Бельскі. – Мінск, 2000. – С.128–131.

5. Гаспадыніч, П. Пераклады Р. Барадуліна / П. Гаспадыніч // Полымя. – 2003. – № 7. – С. 154–166.

6. Гніламёдаў, У. Ад даўніны – да сучаснасці : Нарыс пра беларускую паэзію / У. Гніламёдаў. – Мінск, 2001. – С. 216–221.

7. Гніламёдаў, У. Усё – жывое : Развагі пра паэзію Р. Барадуліна / У. Гніламёдаў // Роднае слова. – 1999. – № 4. – С. 6–17.

8. Законнікаў, С. Пакуль баліць душа... / С. Законнікаў // Полымя. – 1995. – № 1. – С. 217–227.

9. Камейша, К. Абсяг паэта / К. Камейша // Маладосць. – 1995. – № 2. – С. 227–233.

10. Карлюкевіч, А. Рэкі і азёры ў паэзіі Рыгора Барадуліна / А. Карлюкевіч. – Мінск : Пейто, 2000. – 30 с.

11. Рыгор Барадулін : Матэрыялы аб жыцці і творчасці / Р. Барадулін [і інш.] // Крыніца. – 1996. – № 7. – С. 53–82.

12. Скобла, М. Быць нататнікам Бога : пра кнігу "Ксты" Р. Барадуліна / М. Скобла // Роднае слова. – 2006. – № 10. – С. 12–13.

13. Старычонак, В. Філасофская лірыка Рыгора Барадуліна праз прызму метафары / В. Старычонак // Родн. слова. – 2000. – № 2. – С. 17–19.

14. Сушко, Р. “Наш Усявышні пасылае лёс...” / Р. Сушко // Дыялог. – 2006. – № 1. – С. 14–16 [пра веру ў жыцці і творчасці нар. паэта Беларусі, перакл. Р. Барадуліна, а таксам яго кнігу духоўнай паэзіі “Ксты” (2005). Па матэрыялах гутаркі з паэтам].

15. Шпакоўскі, І. Пераадоленне. Пошук выхаду са стылявога тупіка ў Янкі Сіпакова, Рыгора Барадуліна, Васіля Зуёнка / І. Шпакоўскі // Беларуская літаратура ХХ стагоддзя : вучэб. дапам. / М. Мішчанчук, І. Шпакоўскі. – Мінск, 2001. – С. 297–314.

## **ТВОРЧАСЦЬ НІЛА ГІЛЕВІЧА** (нар. у 1931 г.)

Шматграннасць асобы і творчай дзейнасці Н. Гілевіча: паэт-лірык і публіцыст, сатырык і драматург, фалькларыст і літаратуразнаўца, крытык і перакладчык, дзіцячы пісьменнік, грамадскі дзеяч, асветнік, палымяны прамоўца, трыбун.

Звесткі з біяграфіі пісьменніка: ад дзяцінства вясковага хлапчука з мнагадзетнай сям’і да прафесара (1978), заслужанага дзеяча навукі Беларусі (1980), лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Купалы (1980), народнага паэта Беларусі (1991). Багацце творчага плёну пісьменніка (звыш 80-ці кніг). Прызнанне таленту і майстэрства Н. Гілевіча ў замежжы: ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэн Дружбы народаў, Міжнародная літаратурная прэмія імя Хрыста Боцева (1986), балгарскі ордэн Кірылы і Мяфодзія І ступені, ордэн Югаслаўскай зоркі са стужкай, ордэн князя Яраслава Мудрага ІІІ ступені, медаль Францыска Скарыны. Асветніцкая, культурна- адраджэнская дзейнасць Н. Гілевіча.

Радзіма, прырода, бацькі, сям’я, песня ў жыцці паэта. Уплыў Вялікай Айчыннай вайны на ранняе яго сталенне. Уражанні дзяцінства: гібель Хатыні, аблава карнікаў у Слабадзе, пагроза смерці. Адлюстраванне апаленага вайной дзяцінства ў паэме “Недзяленя”, аўтабіяграфічнай кнізе “Перажыўшы вайну”, першым апублікаваным творы “Яблынька”, вершах і баладах “Ты кажаш, я не ведаю вайны”, “Гарыць, гарыць мая Лагойшчына” і інш. Ваенная тэма ў кнігах лірыкі і паэмах Н. Гілевіча: жудаснае аблічча часу, жорсткасць падзей. Выкрыццё злачынстваў фашызму супраць дзяцінства і чалавечнасці.

Пафас рамантыкі, маладой акрыленасці і аптымізму ў першым зборніку “Песня ў дарогу” (1957). Творчая актыўнасць паэта ў другой палове 50-х–60-я гады. Выхад кніг “Прадвесне ідзе па зямлі” (1959), “Неспакой” (1961), “Бальшак” (1965), “Перазовы” (1967), “Лісце трыпутніку” (1968). Асноўныя лірычныя сюжэты, матывы і вобразы гэтых зборнікаў: вобразы маці, Беларусі, матывы памяці пра вайну, народнай песні, любові да роднай мовы, закаханасці,

чалавечага шчасця і інш. Жанрава-кампазіцыйная і стылёвая адметнасць вянка санетаў “Нарач”.

Асаблівасці ідэйна-творчай эвалюцыі паэта ў 70–80-я гады. Класічныя традыцыі і наватарства ў зборніках “А дзе ж тая крынічанька” (1972), “Актавы” (1976), “У добрай згодзе” (1979), “Повязь” (1987). Жанрава- стылёвая разнастайнасць паэзіі Н. Гілевіча: ода, гімн, малітва, элегія, балада, санет, замова, эцюд, казка, байка, эпіграма і інш. Вершаваныя мініяцюры ў форме васьмірадкоўяў (зборнік “Святлынь”, 1984), сяміарадкоўяў (Зб. тв. Т. 3, 2003), жанры танка (зборнік “На флейце самоты”, 2004).

Зборнікі 90-х гадоў: “Незалежнасць” (1991), “Жыта, сосны і валуны” (1992), “Талісман” (1994), “На высокім алтары” (1994), “Ёсць зямля…” (1997) і інш. Узмацненне патрыятычнага гучання ў творчасці паэта. Матывы абароны роднай мовы, адраджэння роднай культуры, абуджэння нацыянальнага жыцця і самасвядомасці – асноўныя тэмы твораў Н. Гілевіча 90-х гадоў. Клопат пісьменніка пра духоўныя асновы быцця, лёс беларускай культуры ў кнізе “Любоў прасветлая” (1996). Узмацненне публіцыстычнага пафасу. Сатырычныя матывы.

Рысы творчай індывідуальнасці Н. Гілевіча: яркая асабовасць думкі, майстэрства красамоўства, прамаўлення, палемікі, спалучэнне лірызму і публіцыстычнасці, глыбіня мастацкіх абагульненняў і інш. Мажорныя і элегічныя інтанацыі.

Канцэпт Беларусі-Радзімы ў Гілевічавай паэзіі. Увасабленне ў творах архетыпаў, народнай сімволікі, нацыянальнага вобраза свету, важных ментальных сэнсаў і паняццяў. Хваласпеў “зямлі, дзе маці нарадзіла”, паэтызацыя хараства роднага краю. Паэтычны культ Радзімы-Беларусі як райскай, святой зямлі. Узнёслы, адычны і малітоўны пафас вершаў патрыятычнага зместу (“Зямля бацькоў, Лагойшчына мая...”, “Край мой беларускі, край!..”, інш.). Выяўленне ў вершах пачуцця нацыянальнай годнасці.

З’яднанасць у светаразуменні Н. Гілевіча паняццяў “мова” і “маці”, “мова” і “Радзіма”, “мова” і “народ”. Працяг паэтам духоўна-адраджэнскіх традыцый Ф. Багушэвіча, Я. Купалы і іншых славутых песняроў. Услаўленне прыгажосці, самабытнасці, высокай вартасці і неўміручасці беларускай мовы (“Тут, між пагоркаў, у гэтых барах і дубровах...”, інш.). Матывы выпрабаванняў і цяжкасцей, якія выпалі на долю роднага слова (“Мова майго народа”, “Роднае слова”, інш.). Мастацкая алегорыя і падтэкст у вершы “Замірае...”. Матывы беражлівага стаўлення да роднай мовы як найвялікшай духоўнай спадчыны беларускага народа, яе існавання (“Страціў слова, страціў спрадвечнае слова...”, інш.). Гістарызм мыслення аўтара (“Старыя друкарні”, “Былая сядзіба асадніка”, “Мара Скарыны”, “Лірычны каментарый да нашага радаслоўя”, інш.). Матывы гістарычнага лёсу Беларусі і гістарычнай памяці, гонар паэта за продкаў, гераічнае мінулае.

Вершы грамадзянскага і сатырычнага гучання з глыбока выяўленай этычнай пазіцыяй (“Спадчына”, “Пра шпаргалку”, “Эгаізм – чалавечых душ іржа...”, інш.). Непрыманне паэтам бездухоўнасці, трывога за маральны стан грамадства (“Раўняюць хлопцы рэчку”, “Будзь жа, браце мой, мудрым!..”, інш.).

Тэматычнае адзінства вершаў Н. Гілевіча пра прыроду. Пакланенне красе прыроды, адлюстраванне навакольнага свету ў яго непаўторных праявах, бачанне мастаком незвычайнага ў звычайным (“Цуд тварыўся – я праспаў...”, “Снежаньская імпрэсія”, “Свята зямлі”, інш.). Экалагічная скіраванасць пейзажнай лірыкі паэта (“Сіняя пушча”, “Даруйце, родныя бары і пушчы...”, інш.). Чарнобыльская праблематыка ў вершах і паэме “Не хварэй!” (1990–1996). Вера аўтара ў добры пачатак чалавека, яго мудрасць. Паэтычна-адухоўленая сувязь з усім існым.

Лірыка прыгожых, рамантычна-ўзвышаных пачуццяў, паэтызацыя духоўнай еднасці і сяброўства, вобраз каханай ў зборніку Н. Гілевіча “І плямы на табе няма” (2003). Услаўленне кахання, жаночай самаахвярнасці, спавядальныя матывы. Псіхалагічная глыбіня ў раскрыцці першага кахання героя-падлетка ў паэме “Лодачкі” (1998).

Сатырычны і гумарыстычны талент паэта. Зборнікі гумару і сатыры “Званковы валет” (1961), “Да новых венікаў” (1963), “Ці грэх, ці два” (1970), “Русалка на Нарачы” (1974), “Кантора” (1989), “Дыялог на хаду” (1990), інш. Гісторыя стварэння “Сказа пра Лысую гару”, выданне твора ў апошняй аўтарскай рэдакцыі (2003). Тыпалогія “Сказа...” з іншымі сатырычнымі творамі паэта, раманам у вершах “Родныя дзеці”. Сюжэтна-кампазіцыйная адметнасць паэмы. Яе стылістыка, лексіка і паэтыка. Сатыра і карнавальна- гратэскавы смех у творы.

Раман у вершах “Родныя дзеці” (1985): жанравая адметнасць, сюжэт і кампазіцыя, канфлікт, сістэма вобразаў, праблематыка твора. Ёмістасць аўтарскай думкі, публіцыстычнасць слова. Праблемы сям’і, чалавечых узаемаадносін. Шырыня дачыненняў Сцяпана Вячоркі з людзьмі, прыродай, традыцыямі бацькоўскага краю. Душэўная шчодрасць героя, супярэчлівасць яго натуры. Усхваляваны роздум пра гісторыю, культуру, экалогію роднай зямлі ў лірычных адступленнях. Гумар і іронія ў творы.

Драматургія Н. Гілевіча (п’есы “Не кажы гоп”, “Формула іржавіны”).

Роля паэта ва ўзбагачэнні песеннага мастацтва. Меладычна-песенная аснова паэзіі Н. Гілевіча, яе спалучанасць з традыцыямі вуснай народнай творчасці. Мастацкі феномен верша-песні “Вы шуміце, бярозы” (муз. Э. Ханка). Арганічны сінтэз паэзіі і музыкі ў творах “Я хаджу закаханы” (муз. І. Лучанка), “Палыновая росстань” (муз. Э. Зарыцкага), “Сонца ў азерцы” (муз. Л. Захлеўнага), “Жаўраначка” (муз. Э. Ханка) і інш.

Актыўная праца Н. Гілевіча ў галіне мастацкага перакладу. Перастварэнне на беларускую мову твораў паэтаў Балгарыі. Пераклады са

славенскай, сербахарвацкай, польскай, украінскай, рускай, літоўскай моў. Роля паэта ў папулярызацыі мастацкіх дасягненняў славянскіх літаратур.

Навуковая дзейнасць Н. Гілевіча ў галінах літаратуразнаўства і фалькларыстыкі: "Акрыленая рэвалюцыяй: паэзія "Маладняка" (1962), "Наша родная песня" (1968), "З клопатам пра песні народа" (1970), "Паэтыка беларускай народнай лірыкі" (1975), "Паэтыка беларускіх загадак" (1976), інш. Н. Гілевіч – укладальнік і навуковы рэдактар пяці тамоў беларускага фальклору ў сучасных запісах.

## ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ
## **Шматграннасць творчасці Ніла Гілевіча**

1. Выявіце факты біяграфіі Н. Гілевіча, якія спрыялі яго станаўленню як беларускага пісьменніка.

1.1 Падбярыце матэрыял "Штрыхі да партрэта пісьменніка".

2. Вершаваны калейдаскоп. Прачытайце вершы паэта, якія найбольш уразілі.

3. Абмеркаванне пытанняў:

3.1 Акрэсліце шматграннасць творчасці Н. Гілевіча.

3.2 Паразважайце, да якой мастацка-стылёвай плыні сучаснай беларускай паэзіі найбольш прывязана паэзія Н. Гілевіча. Вызначце яе тэматычны дыяпазон.

3.3 Вызначце мастацкія асаблівасці твораў ваеннай тэматыкі (першы апублікаваны твор "Яблынька", вершы і балады "Ты кажаш, я не ведаю вайны", "Гарыць, гарыць мая Лагойшчына", паэма "Недзяленя", аўтабіяграфічная кніга "Перажыўшы вайну" і інш.).

3.4 Якое ўвасабленне ў Гілевічавай творчасці набыў вобраз маці-Радзімы? Адказ падмацуйце прыкладамі.

3.5 Прадэманструйце прыклады пейзажнай, інтымнай, філасофскай лірыкі паэта.

3.6 Раскрыйце жанрава-стылёвыя асаблівасці паэзіі Н. Гілевіча, класічныя традыцыі і наватарства ў галіне паэтыкі. Адказ падмацуйце прыкладамі са зборнікаў "А дзе ж тая крынічанька", "Актавы", "Святлынь", "На флейце самоты" і інш. Акрэсліце фальклорныя матывы ў творчасці паэта.

3.7 Якія тэмы і матывы сталі вызначальнымі ў зборніках 90-х гадоў ("Незалежнасць", "Жыта, сосны і валуны", "Талісман", "На высокім алтары", "Ёсць зямля..." і інш.)? Чым гэта тлумачыцца?

3.8 Прааналізуйце эпічныя творы Н. Гілевіча: паэму "Песня аб вячыстым дубе", аўтабіяграфічную хроніку "Сто вузлоў памяці", патрыятычную араторыю з баладамі "Гарыць, гарыць мая Лагойшчына", паэмы "А дзе ж тая крынічанька?", "Заручыны", "Не хварэй!", "Паланез Агінскага",

інш.). Раскрыйце іх тэматыку і праблематыку, ідэйна-мастацкі змест, жанрава-стылёвыя асаблівасці. Што дало падставы У. Конану "эталонам паэм-быліцаў, вядомых з часоў В. Дуніна-Марцінкевіча" назваць спавядальную паэму Н. Гілевіча "Лодачкі"? Раскрыйце ідэйную задуму твора і яго кампазіцыю. Паразважайце пра гуманістычныя каштоўнасці ў сістэме вобразаў.

3.9 Зрабіце праблемна-тэматычны аналіз рамана ў вершах "Родныя дзеці". Якая тэма з'яўляецца ў творы цэнтральнай? У чым яе наватарства? Выкажыце свае адносіны да герояў рамана. Пакажыце ролю лірычных адступленняў у вырашэнні аўтарскай задумы. Для чаго Н. Гілевіч уводзіць у твор гумар і іронію? Які ўрывак з рамана будзеце рэкамендаваць вучням для завучвання на памяць?

3.10 Выберыце з кнігі "Любоў прасветлая" найбольш красамоўныя, найбольш прачулыя роздумы пісьменніка аб роднай мове, нацыянальнай свядомасці і культуры.

4. Падрыхтуйце паведамленні "Публіцыстычная дзейнасць Н. Гілевіча", "Перакладчыцкая дзейнасць Н. Гілевіча", "Драматургічныя творы Н. Гілевіча".

6. Вывучыце на памяць верш Н. Гілевіча або ўрывак з рамана "Родныя дзеці".

***У школьную праграму ўключаны наступныя творы Н. Гілевіча:*** вершы "Маці" (7 кл.); "Ах, якая над Гайняй купальская ноч!..", "Святочны, старажытны дух калядны...", "Паклон табе, мой беларускі краю!..", раман у вершах "Родныя дзеці" (ва ўрыўках); для завучвання на памяць: верш або ўрывак з рамана ў вершах "Родныя дзеці" (на выбар настаўніка) (11 кл.).

**ТВОРЫ апошніх гадоў**

1. Гілевіч, Н. Збор твораў : у 23 т. / Н. Гілевіч ; прадм. аўт. – Мінск : Кніга, 2003. – Т. 1 : Вершы 1946–1990. – 414 с.

2. Гілевіч, Н. Збор твораў : у 6 т. / Н. Гілевіч ; прадм. У. Конана. – Мінск : Маст. літ., 1996–2003. – Т. 1–4.

3. Гілевіч, Н. Запісы. З дзённікаў розных гадоў. Сшытак першы. 1954–1983 / Н. Гілевіч. – Мінск : Про Хрысто, 2006.

4. Гілевіч, Н. З нарыса з маёй радаслоўнай / Н. Гілевіч // Роднае слова. – 2005. – № 5. – С. 82–86.

5. Гілевіч, Н. Лесам песня ішла : Вершы / Н. Гілевіч. – Мінск : Кніга, 2001. – 320 с.

6. Гілевіч, Н. На флейце самоты : Лірычныя мініяцюры ў жанры "танка" / Н. Гілевіч. – Мінск : Про Хрысто, 2004. – 89 с.

7. Гілевіч, Н. Разумная дзевачка : маленькая аповесць пра адно дзяцінства / Н. Гілевіч. – Мінск : Про Хрысто, 2005. – 123 с.

8. Гілевіч, Н. Родныя дзеці ; Паэмы / Н. Гілевіч ; аўт. прадм. В. Ляшковіч ; маст. Г. Грак. – Мінск : Кніга, 2001. – 448 с.

9. Гілевіч, Н. Сказ пра Лысую гару : у апошн. аўт. рэд. / Н. Гілевіч ; прадм. У. Конана. – Мінск : Белфранс, 2003. – 48 с.

10. Гілевіч, Н. Шчаслівыя хвіліны : Вершы, казкі, байкі, небыліцы, загадкі / Н. Гілевіч. – Мінск : Юнацтва, 2001. – 247 с.

**Асноўная літаратура**

1. Гілевіч Ніл // Беларускія пісьменнікі : Біябібліягр. слоўн. : у 6 т. / Ін-т літ. імя Я. Купалы ; рэдкал. : І. Багдановіч [і інш.]. – Мінск : “Беларус. энцыкл.”, 1992–1995. – Т. 2 : Верабей – Іваноў. – 1993. – С. 185–204.

2. Конан, У. Ніл Гілевіч / У. Конан // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – 2-е выд. – Мінск : Беларус. навука, 2001–2002. – Т. 4. Кн. 1. – 2002. – С. 412–438.

3. Мішчанчук, М. “Каб толькі ўчуў-пачуў мой верш, як плача сэрца Беларусі...” Кніга Н. Гілевіча “На высокім алтары” / М. Мішчанчук // Беларуская літаратура ХХ стагоддзя : вуч. дапам. / М. Мішчанчук, І. Шпакоўскі. – Мінск, 2001. – С. 341–350.

**Дадатковая літаратура**

1. Бельскі, А. На алтар любові і кахання / А. Бельскі // Краса і смутак / А. Бельскі. – Мінск, 2000. – С. 132–136.

2. Гарэлік, Л. На высокім алтары / Л. Гарэлік // Роднае слова. – 2001. – № 9. – С. 5–9.

3. Гілевіч, Н. “Я вельмі любіў глядзець, як мама купае малых...” / Н. Гілевіч // Звязда. – 1999. – 9 лют.

4. Конан, У. На прасветлым алтары Радзімы : літаратуразнаўчае эсэ / У. Конан // Полымя. – 2001. – № 9. – С. 232–260.

5. Конан, У. Ніл Гілевіч – пісьменнік універсальнага таленту / У. Конан // Роднае слова. – 2006. – № 9. – С. 84–86.

6. Конон, В. “Мой усім вам паклон зямны...” / В. Конон // Нёман. – 2001. – № 9. – С. 176–196.

7. Навасельцава, І. “Маё багацце ўсё ў слове...” / І. Навасельцава // Маладосць. – 2001. – № 10. – С. 197–209.

8. Ніл Гілевіч : [матэрыялы аб жыцці і творчасці] / Л. Галубовіч [і інш.] // Крыніца. – 2001. – № 3. – С. 3–58.

9. Сямёнава, А. Мелодыя душы перад святлом вечнасці / А. Сямёнава // Наша вера. – 2005. – № 4. – С. 51–53. – Рэц. на кн. : Гілевіч, Н. На флейце самоты : Лірычныя мініяцюры ў жанры “танка” / Н. Гілевіч. – Мінск : Про Хрысто, 2004. – 89 с.

## СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ДРАМАТУРГІЯ

Крызісны стан беларускай драматургіі ў 70–80-я гады, яго прычыны і шляхі пераадолення. Выхад з крызісу на хвалі другога нацыянальнага

адраджэння на пачатку 90-х гадоў. Творчасць драматургаў розных творчых пакаленняў. А. Петрашкевіч, І. Чыгрынаў, М. Матукоўскі – прадстаўнікі старэйшага пакалення. А. Дудараў – прадстаўнік сярэдняга пакалення сучасных драматургаў. Шматлікасць маладой генерацыі пісьменнікаў (С. Кавалёў, У. Бутрамееў, А. Федарэнка, М. Арахоўскі, інш.). Роля тэатра-лабараторыі нацыянальнай драматургіі "Вольная сцэна" ў падтрымцы і выхаванні маладых драматургаў. Традыцыйнае і наватарскае ў іх творчасці. Пошук новых жанравых форм, арыентацыя на еўрапейскую мадэрнісцкую традыцыю, творчае эксперыментатарства (п'есы-адаптацыі, рэпрадукцыі, кантамінацыі, п'есы-гульні, гістарычныя фантазіі, фальклорныя варыяцыі, інш.). П'еса-рымейк у сучаснай драматургіі. Гістарычныя рэтраспекцыі ў драматургіі (І. Чыгрынаў, А. Петрашкевіч, А. Дудараў, Р. Баравікова, інш.). Сатыра і гумар у камедыях Г. Марчука, У. Сауліча, А. Федарэнкі і інш. Абсурдысцкая і герменеўтычная беларуская п'еса (С. Кавалёў "Стомлены д'ябал", "Звар'яцелы Альберт", "Францішка, або Навука кахання", інш.). Драма абсурду М. Арахоўскага "Ку-ку", фарс-абсурд І. Сідарука "Галава".

Драматургія для дзяцей. "Рыцарская" п'еса (С. Кавалёў, Л. Рублеўская, П. Васючэнка, інш.). Сцвярджэнне гуманістычных каштоўнасцей у казках-прыпавесцях П. Васючэнкі "Стражнік Гам", "Маленькі збраяносец", інш.

**Творчасць М. Матукоўскага** (1929–2001)

Камедыя-вадэвіль "Мужчына, будзь мужчынам, або Уваскрэсенне Дон Кіхота" (1965), драма "Тры дні і тры ночы" (1967) – першыя драматургічныя творы М. Матукоўскага. Сацыяльна-маральная завостранасць канфлікту ў п'есах "Амністыя" (1970), "Апошняя інстанцыя" (1974), "Наследны прынц" (1976), "Паядынак" (1985). Праблематыка твораў драматурга, іх жанравая адметнасць. Майстэрства тыпізацыі і камізму ў п'есе "Мудрамер" (1987). Публіцыстычная скіраванасць драмы "Бездань" (1992), выяўленне ў ёй складанасці ўнутранага стану чалавека. Гратэск і парадокс у мастацкай сістэме камедыі "Калізей" (1992). Камедыя "Зомбі, альбо Мудрамер-два" (1998). Драматургічнае перастварэнне казкі "Сярэбраная табакерка" З. Бядулі і аповесці В. Быкава "Альпійская балада" ("Беражыце эдэльвейсы").

**Творчасць Алеся Петрашкевіча** (1930–2012)

Асоба А. Петрашкевіча – выдатнага пісьменніка-энцыклапедыста, драматурга, публіцыста, празаіка, актыўнага адраджэнца беларускай гісторыі, кіраўніка арганізацыйна-метадычнага цэнтра па выданні гістарычна-дакументальных хронік "Памяць" (1991–1998), Заслужанага работніка культуры Беларусі (1975), лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1976).

П'есы "Адкуль грэх" (1970), "Злыдзень" (1973), "Трывога" (1974), "Укралі кодэкс" (1976) – першыя драматургічныя творы пісьменніка. Экалагічная праблематыка драмы "Соль" (1980). Сацыяльная завостранасць

ранніх п’ес. Праблема вынішчэння гістарычных помнікаў і гістарычнай памяці ў драме “Мост упоперак ракі” (1982).

Пашырэнне і паглыбленне творчага дыяпазону драматурга ў 90-я гады. З’яўленне п’ес так званага “перабудовачнага” часу з выяўленнем поглядаў аўтара на дзяржаву, мову, нацыянальную ідэю: драма “Дагарэла свечачка…” (чарнобыльская катастрофа і яе наступствы), “Інтэлігенты” (раскол нацыі беларусаў), “Прагноз на паслязаўтра” (рэпрэсіі супраць дэмакратыі), палітычная сатыра “Інтэрнацыянал па-беларуску”.

Гістарычнае мінулае Беларусі ў асэнсаванні А. Петрашкевіча: “Гора і слава” (“Русь Кіеўская”) (трагедыя Полацкага княства і хрышчэнне Русі), “Меч Рагвалода” (бітва на Нямізе і лёс Усяслава Чарадзея), “Крыж святой Еўфрасінні”, трагедыя “Крыжовы шлях на Грунвальд”, “Расплата за здраду” (мяцеж Міхайлы Глінскага і яго спроба далучэння ВКЛ да Масковіі), “Рупнасць дзяржаўцы” (дзейнасць Льва Сапегі), дылогія пра Ф. Скарыну “Напісанае застаецца” і “Прарок для Айчыны”, дылогія пра паўстанні Т. Касцюшкі і К. Каліноўскага “Развітанне з Радзімай” і “Рыцар Свабоды”, “Апошні зборны чын” (Слуцкае антысавецкае паўстанне 1920 г.), трагедыя “Воля на крыжы” (лёс Я. Купалы). Інтэлектуальна-філасофскі змест твораў.

Кнігі гістарычна-дакументальных драм і трагедый “Воля на крыжы” (2000) і “Здрапеданая зямля” (2003). “Здрапеданая зямля” – цэласны канцэптуальна твор, аб’яднаны сімвалічнай назвай і падзелены на дзве часткі: “Супрацьборства” (гістарычныя драмы “Расплата за здраду”, “Каралеўска-царская пастка”, “Рупнасць дзяржаўцы”, гістарычная трагедыя “Крыжовы шлях на Грунвальд”) і “Вынішчэнне” (гістарычныя трагедыі і драмы “Час усё адкрые…”, “Развітанне з Радзімай”, “Рыцар Свабоды”, “Апошні збройны чын”, “Наканавана быць Прарокам”, “Дагарэла свечачка…”).

**Творчасць Аляксея Дударава** (нар. у 1950 г.)

Асоба і творчасць А. Дударава ў кантэксце сучаснай беларускай драматургіі. Дасканалае веданне ім законаў сцэны. Сцэнічнасць яго п’ес.

Жыццяпіс і творчасць. Шлях да поспеху. Акцёрская кар’ера. Творчыя пошукі свайго стылю ў драматургіі.

Зборнік апавяданняў “Святая птушка” (1979). Жанрава-стылёвыя асаблівасці прозы А. Дударава, праблема драматызацыі сюжэта. Вобразы герояў-“дзівакоў” як носьбітаў беларускіх уяўленняў пра мараль (павышаная чуласць, ранімасць, арыентацыя на высокае і прыгожае ў жыцці, вонкавая прасцякаватасць). Праблема духоўнасці ў бездухоўным свеце. Тыпалогія твораў А. Дударава і В. Шукшына. Сувязь дудараўскіх персанажаў з традыцыйнымі героямі твораў беларускіх класікаў, а таксама блазнамі – дзівакамі, жартаўнікамі, прытворшчыкамі, з сусветнай традыцыяй “карнавальнай літаратуры”.

П’есы “Выбар” (1979) і “Апошні ўзлёт” (1982) – першыя драматургічныя

творы А. Дударава. П’еса “Парог” (1981) – першая паспяховая спроба драматурга асэнсаваць адвечныя праблемы чалавечага быцця. Вобраз галоўнага героя Андрэя Буслая, “жывога нябожчыка”, і літаратурныя пераклічкі з п’есай Л. Талстога “Жывы труп”. Сімваліка-метафарычны пласт у змесце п’есы (вобраз “парога”). Маналогі Буслая і актуальнасць іх маральна-духоўнага сэнсу. Вобраз казачніка Пакутовіча, “лекара чалавечых душ”. Аналогіі і паралелі з п’есамі рускага драматурга А. Вампілава і кінасцэнарыямі В. Шукшына. Руская і беларуская крытыка пра п’есу.

Актуальнасць маральна-этычнай праблематыкі ў п’есе “Вечар” (1983). Яскравыя людскія тыпы (Гастрыт, Мульцік, Ганна). Канфлікт асобы і асяроддзя. Антыномія як прынцып пабудовы сістэмы вобразаў. Рамантыкі і рэалісты, ідэалісты і прагматыкі. Асэнсаванне аўтарам і яго персанажамі паняццяў “душа”, “ідэал”, “спагада”, “міласэрнасць”, “літасць” як асновы духоўнай парадыгмы нацыянальна-беларускага існавання ў свеце.

П’еса “Радавыя” (1984), яе сцэнічны поспех. Уганараванне аўтара Дзяржаўнай прэміяй СССР (1985). Ідэйна-вобразныя і жанрава-стылёвыя асаблівасці твора ў кантэксце беларускай і рускай “ваеннай прозы”. Сістэма вобразаў. Рэха вайны ў людскіх душах, у чалавечай падсвядомасці. Асабістыя трагедыі Дзерваеда, Адуванчыка, Дугіна, Саляніка. Міфалагічныя вобразы (Жаночы прывід). Мастацкая функцыя прыёму перадгісторыі ў паказе герояў, іх маналогаў і споведзяў. Вобраз вайны ў п’есе. Сцвярджэнне адвечных гуманістычных каштоўнасцей ва ўмовах вайны і маральна-этычная аўтарская ацэнка гістарычных падзей. Вобразнае пераасэнсаванне паняццяў-сімвалаў “душа”, “дабро”, “міласэрнасць” і інш. Падыход драматурга да актуальнай праблемы гераізму і ахвярнасці, цаны Перамогі, духоўна-маральных наступстваў ваеннай трагедыі і яе рэха ў нацыянальнай гісторыі.

Творчы пошук у час змены літаратурнага цыкла. Ідэйна-мастацкія і жанрава-стылёвыя эксперыменты ў сферы сюжэта (тэатральныя эфекты, чыста драматургічныя прыёмы, схематызм вобразаў). Новыя героі (“лішнія людзі”, “людзі дна”, бамжы, бадзягі) ў п’есе “Злом” (1987). Адносіны да класікі драматургіі (М. Горкі, А. Камю, Ж.-П. Сартр, С. Бэкет, Э. Ёнэска, С. Мрожак). Вобраз Злома – “сметніка” сучаснай рацыяналістычна-прагмагычнай цывілізацыі як тупіковага шляху яе развіцця. Змест маналогаў і споведзяў герояў, непрынятцце імі культу насілля і агрэсіі, увасобленага ў вобразах “брыгадзістаў”.

Рэальнае і фантастычнае ў драме “Адцуранне” (1994), раскрыццё ў ёй трагізму Чарнобыля. Засваенне драматургічнага вопыту майстроў сімвалісцкай трагедыі (сімволіка, умоўнасць, фантасмагорыя, “кніжнасць”).

Зварот да нацыянальнай гісторыі ў п’есах зборніка “Князь Вітаўт”: “Купала” (1994), “Палачанка” (1998), “Чорная панна Нясвіжа” (1998), “Крыж” (2000), інш. Гістарычная праўда і творчая фантазія А. Дударава. “Новы”

Дудараў. Мастацкае пераасэнсаванне ("тэатралізацыя") беларускай гісторыі. Вобразы беларускіх жанчын (Рагнеда, Еўфрасіння Полацкая, Барбара Радзівіл). Вобразы антыгерояў (Бона Сфорца, Мнішак, Бжэнка). Творчы працяг маральна-этычных пошукаў драматурга на гістарычным матэрыяле і хрысціянская традыцыя. Спроба аўтара зрабіць пэўныя філасофскія высновы. Шэкспіраўская тэатральная традыцыя ў інтэрпрэтацыі А. Дударава (сюжэтная хранікальнасць, тэатральная відовішчнасць, вольны верш, масавыя сцэны, асаблівасці кампазіцыі, пабудова мізансцэн, імклівая змена месца дзеяння, пераключэнне стылёвых рэгістраў, вобразы міфалогіі, сімволіка дэталяў і падрабязнасцей).

П'есы "Кім" (2000) і "Люці" (2002), іх праблематыка, жанравая адметнасць і вобразы-персанажы.

А. Дудараў – сцэнарыст мастацкіх фільмаў ("Белыя росы", "Суседзі", "Кола" і інш.). Пераклады і інсцэніроўкі драматургічнай класікі на беларускай сцэне ("Песня пра зубра", "Рычард III", "Макбет", "Гамлет", інш.). Погляды А. Дударава на перспектывы інтэграцыі беларускай драматургіі і нацыянальнага тэатра ў еўрапейскі літаратурна-культурны працэс.

**Творчасць Міколы Арахоўскага** (1950–1997). Трагізм лёсу. Зварот да драматургічнай дзейнасці. Неардынарнасць і своеасаблівасць аўтарскага мыслення. Найбольш вядомыя творы драматурга – п'еса "Напярэдадні" (1987), трагікамедыя "Машэка" (1989, пастаноўка п'есы Брэсцкім абласным драматычным тэатрам), драма абсурду "Ку-ку" (1991), "Лабірынт" (1997).

Спалучэнне традыцыі і эксперыменту ў творах М. Арахоўскага. "Антыалкагольная" п'еса "Напярэдадні" як самы традыцыйны твор пісьменніка. Выяўленне духоўна-маральнай трагедыі грамадства ў трагікамедыі "Машэка". Вобразы Халіпскага, Яся. Нетрадыцыйная мастацкая канцэпцыя вобраза Машэкі. Праблема празрэння чалавечай душы ў творы.

Ацэнка п'есы "Ку-ку" крытыкай на ўзроўні еўрапейскага мастацтва. Асэнсаванне праблематыкі, назвы, вобразнай сістэмы твора ў кантэксце рускай і сусветнай літаратуры і мастацтва. Асэнсаванне абсурднасці чалавечага існавання без Бога ў душы, страта сэнсу жыцця.

Філасофскі змест п'есы "Лабірынт". Вобразы мастака Стаха, Лілі, Жаны. Майстэрства паказу М. Арахоўскім чалавечай душы перад адыходам у Вечнасць. Творчая эвалюцыя драматурга.

## ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ
## **Сучасная беларуская драматургія**

1. Раскажыце пра крызісны стан беларускай драматургіі ў 70 – першай палове 80-х гадоў, яго прычыны і шляхі пераадолення. Чаму другое нацыянальнае адраджэнне пачатку 90-х гадоў спрыяла выхаду з гэтага крызісу?

2. Назавіце прадстаўнікоў творчых пакаленняў сучаснай драматургіі.

3. Акрэсліце ролю А. Петрашкевіча як прадстаўніка старэйшага пакалення ў развіцці беларускай драматургіі.

3.1 Вызначце праблемна-тэматычны дыяпазон ранніх п’ес “Адкуль грэх?”, “Трывога”, “Соль”.

3.2 Якую тэму распачынаў А. Петрашкевіч драмамі “Гора і слава” (“Русь Кіеўская”), “Напісанае застаецца”, “Прарок для Айчыны”?

3.3 Як вы разумееце сэнс назваў кніг “Воля на крыжы” і “Здрапежаная зямля”? Што сабою ўяўляе апошняя з іх? З якіх частак складаецца? Якія творы ў яе ўвайшлі? Чым вызначаюцца гістарычныя п’есы А. Петрашкевіча? Чаму, на вашу думку, завяршаецца кніга драмай “Дагарэла свечачка...”, прысвечанай чарнобыльскай тэме?

4. Вызначце месца А. Дударава ў сучаснай літаратуры і культуры. Ці можна без яго твораў уявіць сучасны тэатр? Адказ абгрунтуйце.

4.1 Раскажыце пра прыход А. Дударава ў драматургію. Назавіце раннія творы драматурга. Выявіце мастацкія асаблівасці і актуальнасць п’ес “Парог” і “Вечар”.

4.2 Якія драматургічныя творы прысвяціў А. Дудараў тэме вайны? Акрэсліце сярод іх месца драмы “Радавыя”. Зрабіце праблемна-вобразны аналіз твора.

4.3 Што аб’ядноўвае п’есы А. Дударава “Купала”, “Крыж”, “Палачанка”, “Чорная панна Нясвіжа”? Назавіце назву зборніка, які яны склалі.

5. Вызначце ролю М. Арахоўскага ў развіцці сучаснай драматургіі. Што дало падставы даследчыкам гаварыць аб спалучэнні ў яго творчасці традыцыі і наватарства?

5.1 Назавіце найбольш вядомыя творы М. Арахоўскага. Выявіце іх мастацкія асаблівасці. Акрэсліце традыцыйнае і наватарскае ў п’есах “Машэка”, “Ку-ку”, “Лабірынт”. Што дало падставы літаратуразнаўцам п’есу “Ку-ку” ацэньваць на ўзроўні еўрапейскага мастацтва?

5.2 Вызначце філасофскі змест твораў М. Арахоўскага. Прасачыце творчую эвалюцыю драматурга.

6. Прадстаўце “маладую” драматургію ў творчых пошуках У. Бутрамеева, А. Федарэнкі, С. Кавалёва, І. Сідарука, Г. Каржанеўскай, інш. Што вызначае сярод іншых драматургічныя творы С. Кавалёва? Зрабіце праблемна-вобразны аналіз прачытаных твораў.

7. Назавіце драматургаў-берасцейцаў і іх найбольш вядомыя творы.

8. Акрэсліце праблемна-тэматычную і жанрава-стылёвую разнастайнасць беларускай драматургіі 90– пач. XXI ст.

***У школьную праграму ўваходзяць п’есы:*** “Вечар” або “Кім” А. Дударава (8 кл.); “Князь Вітаўт” А. Дударава, “Напісанае застаецца” або “Прарок для Айчыны” А. Петрашкевіча, “Страсці па Аўдзею” У. Бутрамеева, “Драўляны

Рыцар”, “Шлях да Бэтлеему”, “Звар’яцелы Альберт”, “Стомлены д’ябал” С. Кавалёва (11 кл.).

**Крыніцы**


1. Арахоўскі, М. Ку-ку / М. Арахоўскі // Сучасная беларуская п’еса / Склад. П. Васючэнка. – Мінск : Маст. літ., 1997. – С. 248–285.

2. Арахоўскі, М. Машэка / М. Арахоўскі // Сучасная беларуская п’еса / Склад. В. Марчук. – Мінск : Маст. літ., 1992. – С. 84–127.

3. Дарункі добрых духаў : П’есы для аматарскіх тэатраў / Уклад. Г. Каржанеўская, І. Скрыпка ; М-ва культ. РБ, БелДІПК. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2007.

4. Дудараў, А. Князь Вітаўт : п’есы / А. Дудараў. – Мінск : Маст. літ., 2005. – 318 с.

5. Дзялендзік, А. Легенда пра Анастасію Слуцкую ; Князь Міхаіл Глінскі : гіст. дылогія (літ. сцэнарыі) / А. Дзялендзік. – Мінск : Маст. літ., 2008. – 142 с.

6. Звон – не малітва : п’есы : для ст. шк. узросту / Уклад. І. Дабрыян ; прадм. П. Васючэнкі. – Мінск : Маст. літ., 2008. – 365 с. – (Бібліятэка школьніка).

7. Кавалёў, С. Стомлены д’ябал : П’есы / С. Кавалёў. – Мінск : Логвінаў, 2004. – 189 с.

8. Кавалёў, С. Шлях да Бэтлеему : п’есы-казкі : для сярэд. і ст. шк. узросту / С. Кавалёў. – Мінск : Маст. літ., 2009. – 231 с. – (Школьная бібліятэка).

9. Каржанеўская, Г. На сцэне дня : Зб. п’ес для лялечных і драматычных аматарскіх тэатраў / Г. Каржанеўская. – Мінск : БелДІПК, 2004. – 184 с.

10. Матукоўскі, М. Мудрамер. Паядынак / М. Матукоўскі // Беларуская п’еса : Драматычныя творы. – Мінск, 1996. – С. 227–368.

11. Напісанае застаецца : сучасная беларуская драматургія : для ст. шк. узросту. – Мінск : Маст. літ., 2011. – 228 с. – (Школьная бібліятэка).

12. Петрашкевіч, А. Здрапежаная зямля : Гістарычныя п’есы / А. Петрашкевіч. – Мінск : УП “Тэхнапрынт”, 2003. – 447 с.

13. Рублеўская, Л. Людвіка і Фабіян : гіст. драма / Л. Рублеўская, В. Скалабан. – Мінск : Выдавец В. Хурсік, 2006.

14. Сідарук, І. Віртуальнае зубраня : Зб. п’ес для аматарскіх і лялечных тэатраў / І. Сідарук ; М-ва культуры РБ. БелДІПК. – Мінск : БелДІПК, 2004. – 147 с.

15. Сучасная беларуская драматургія : традыцыі і наватарства / Уклад. і прадм. П. Васючэнкі ; рэдкал. : Г. Алісейчык [і інш.] ; пад агульн. рэд. У. Сіўчыкава. – Мінск : ТАА “Сэр-віт”, 2003. – 639 с.

## Асноўная літаратура

1. Бязлепкіна, А. Драматургія / А. Бязлепкіна // 100 слоў пра сучасную беларускую літаратуру / А. Бязлепкіна. – Мінск : Лімарыус, 2012. – С. 61–62.

2. Васючэнка, П. Сучасная беларуская драматургія : Дапам. для настаўнікаў / П. Васючэнка. – Мінск, 2000. – 158 с.

3. Каваленка, В.А. Алесь Петрашкевіч / В.А. Каваленка // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. Т. 4. Кн. 2. 1986–2000 / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы ; навук. рэд. У. Гніламёдаў, С. Лаўшук. – Мінск : Беларус. навука, 2003. – С. 336–351.

4. Макмілін, А. П’есы тэатральныя і літаратурныя // Пісьменства ў халодным клімаце. Беларуская літаратура ад 70-х гг. ХХ ст. да нашых дзён / А. Макмілін. – С. 546–585.

5. Лаўшук, С. Гарызонты беларускай драматургіі / С. Лаўшук ; НАН Беларусі, Ін-т мовы і літаратуры. – Мінск : Беларус. навука, 2010. – 412 с.

## Дадатковая літаратура

1. Андруковіч, А. Думкі пра сучасную беларускую драматургію і тэатр / А. Андруковіч // Беларуская мова і літар. – 2013. – № 5. – С. 41–48.

2. Арахоўскі Мікалай // Беларускія пісьменнікі : Біябібліягр. слоўн. : у 6 т. / Ін-т літ. імя Я. Купалы ; рэдкал.: І. Багдановіч [і інш.]. – Мінск : “Беларус. энцыкл.”, 1992–1995. – Т. 6 : Талалай – Яфімаў. Дадатак. – 1995. – С. 542.

3. Аўдоніна, Т. Драма А. Дударава “Адцуранне” / Т. Аўдоніна // Беларуская мова і літаратура. – 2006. – № 5. – с. 54–59.

4. Грамадчанка, Т. Каб не быць манкуртам : Па старонках гістарычных драм І. Чыгрынава / Т. Грамадчанка // Роднае слова. – 1994. – № 12. – С. 3–7.

5. Дудараў Аляксей // Беларускія пісьменнікі : Біябібліягр. слоўн. : у 6 т. / Ін-т літ. імя Я. Купалы ; рэдкал.: І. Багдановіч [і інш.]. – Мінск : “Беларус. энцыкл.”, 1992–1995. – Т. 2 : Верабей – Іваноў. – 1993. – С. 396–399.

6. Дудараў, А. “У драматургіі стаць папулярным надзвычай складана” / А. Дудараў ; гутарыла Т. Команава // Культура. – 2005. – 10–16 сн. – С. 13.

7. Конеў, Я. Падчарка ва ўласным доме / Я. Конеў // Маладосць. – 2013. – № 1. – С. 93–95 [аналіз сучаснай беларускай драматургіі і яе доля ў пастаноўках беларускіх нацыянальных тэатраў].

8. Лаўшук, С. Сучасны беларускі тэатр: праблемы, праблемы, праблемы... / С. Лаўшук ; падр. матэр. А. Трафімчык // Маладосць. – 2013. – № 1. – С. 96–100.

9. Маляўка, П. Духоўны катарсіс драматычнага героя праз прызму мастацкага светабачання : п’еса “Парог” А. Дударава / П. Маляўка. – Роднае слова. – 2006. – № 4. – С. 22–23.

10. Патук, Т. Да юбілею А. Петрашкевіча / Т. Патук // Бібліятэка прапануе. – 2005. – № 2. – С. 24 [пра А. Петрашкевіча і яго зб. “Здрапежаная зямля”].

11. Петрашкевіч Алесь // Беларускія пісьменнікі : Біябібліягр. слоўн. : у 6 т. / Ін-т літ. імя Я. Купалы ; рэдкал.: І. Багдановіч [і інш.]. – Мінск : “Беларус. энцыкл.”, 1992–1995. – Т. 5 : Пестрак – Сяўрук. – 1995. – С. 13–17.

12. Сальнікава, К. Катэгорыя часу і прасторы ў п’есах А. Дударава / К. Сальнікава // Веснік Брэсцкага дзярж. ун-та імя А.С. Пушкіна. – 2002. – № 5. – С. 51–56.

13. Сохар, М. Пра тое, што з'яўляецца важным / М. Сохар // Маладосць. – 2013. – № 4. – С. 87–93 [аналіз сучаснай беларускай драматургіі і яе доля ў пастаноўках беларускіх нацыянальных тэатраў].

14. Трафімчык, А. Экалагічная тэматыка ў п’есах для дзяцей / А. Трафімчык // Роднае слова. – 2013. – № 6. – С. 16–18.

15. Яніцкі, М. Катарсіс як праблема карэляцыі чалавека і свету ў беларускай драматургіі канца XX–пачатку XXI ст.ст. / М. Яніцкі // Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. Серыя 3. Філалогія, педагогіка, псіхалогія. – 2013. – № 2. – С. 51–55.

## ЛІТАРАТУРА БЕРАСЦЕЙШЧЫНЫ

Слаўныя літаратурныя традыцыі Берасцейшчыны. Роля У. Калесніка ў згуртаванні пісьменніцкіх талентаў на берасцейскай зямлі. Утварэнне літаратурнага аб’яднання “Берасцейскае вогнішча”, абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў (1982). Літаратурныя імёны Берасцейшчыны 60-х гадоў (М. Рудкоўскі, К. Каліна, М. Купрэеў), 70-х гадоў (В. Жуковіч, Н. Мацяш, Р. Баравікова, В. Гардзей, інш.), 80-х гадоў (Л. Пранчак, А. Каско, З. Дудзюк, Л. Дранько-Майсюк, М. Арахоўскі, А. Кажадуб, інш.), 90-х гадоў (Н. Гарагляд, браты В. і А. Дэбішы, М. Сянкевіч, І. Сідарук, інш.), пач. XXI ст. (М. Папека, Я. Дашына, В. Барысюк, А. Паплаўскі, інш.).

Пісьменніцкія гняздоўі: Бярозаўшчына – веска Сялец (А. Разанаў, М. Арахоўскі, В. Супрунчук), Століншчына – Давыд-Гарадок (Г. Марчук, Л. Дранько-Майсюк, У. Глушакоў).

Жанравая разнастайнасць літаратуры Берасцейшчыны: паэзія (А. Разанаў, А. Каско, М. Пракаповіч, Н. Загорская, Я. Янішчыц, Н. Мацяш, З. Дудзюк, інш.); проза (Я. Пархута, Г. Марчук, У. Глушакоў, А. Наварыч, З. Дудзюк, інш.); драматургія (М. Арахоўскі, Г. Марчук, І. Сідарук, З. Дудзюк, інш.); пераклады (В. Жуковіч, Н. Мацяш, М. Рудкоўскі, інш.); крытыка і літаратуразнаўства (У. Калеснік, А. Майсейчык, В. Ляшук, У. Гніламёдаў, І. Чарота, І. Штэйнер, інш.). Жанравая разнастайнасць паэзіі Берасцейшчыны (трыялет, санет, рубаі, танка, інш.). Зборнік “Дзядзінец” – першая анталогія берасцейскай паэзіі на мяжы стагоддзяў. Літаратурны альманах “Жырандоля”.

Шырыня тэматычнага дыяпазону літаратуры Берасцейшчыны. Творчыя індывідуальнасці.

**Творчасць Алеся Разанава** (нар. у 1947).

Шлях у літаратуру. Першы паэтычны зборнік "Адраджэнне" (1970), яго ўспрыняцце крытыкай. Матывы і ідэі зборнікаў "Назаўжды" (1974), "Каардынаты быцця" (1976). Традыцыйнае і наватарскае ў лірыцы 70-х гадоў. Выхад на абсягі мадэрнісцкай паэтыкі. Пункціры – новая форма вершаў А. Разанава, з якой выраслі ў далейшым такія жанры як версэты, квантэмы і зномы. Арыгінальнасць і наватарства зборніка "Шлях-360" (1981). Складаная паэтычная кампазіцыя, экспрэсіўнасць, сімвалізм і біблейскія алюзіі ў паэмах зборніка ("Першая паэма шляху", "Другая паэма шляху", "Паэма рэха" і інш.). Зборнік "Вастрыё стралы" (1988) – падагульненне і завяршэнне другога этапу творчых пошукаў і эксперыментаў паэта. Імкненне да інтэлектуальнага, філасофскага асэнсавання глабальных праблем. Версэты як жанр філасофскай лірыкі і яго прыкметы. Жанр вершаказаў як спроба спалучыць у паэтычным вобразе рэальнае і філасофскае, духоўна-сімвалічнае. Неадназначная сімволіка, авангардны стыль зборніка.

Творчасць А. Разанава 90-х гадоў. Зборнікі "У горадзе валадарыць Рагвалод" (1992) і "Паляванне ў райскай даліне" (1995). Паэтычная герменеўтыка, адзінства паэзіі і быцця, слова і рэчы ў вершах. Кніга паэзіі "Танец з вужакамі" (1999). Зборнікі "Рэчаіснасць"(1998), "Гановерскія пукціры" (2002). Кніга "Wortdichte", напісаная па-нямецку (2003). Паэмы "Гліна", "Камень", "Жалеза" і сэнс архетыпаў беларускай ментальнасці. Пераклады з іншых моў свету.

А. Разанаў – рэфарматар беларускай і агульнаеўрапейскай паэзіі. Сузіральная інтуіцыя як аснова мастацкай думкі паэта. Паэтычны міфалагізм і культуралогія, парадаксальнасць метафар, збліжэнне слова і музыкі – адзнакі твораў Разанава. Чалавек і свет, існаванне і быццё, асоба і народ у кантэксце сусвету і новай, створанай аўтарам, рэчаіснасці.

**Творчасць Міхася Рудкоўскага** (1936–1991). Звесткі з біяграфіі. Паэтычныя зборнікі: "Першыя вёрсты" (1963), "Позвы" (1971), "У краі тым" (1975), "Векавечная Бацькаўшчына" (1976), "Трыгор'е" (1981), "Засцярога" (1984), "Залатазвон" (1986), "Гарынь" (1992). Лірызм, яркая вобразнасць, непасрэднасць і шчырасць пачуцця – вызначальныя рысы паэзіі М. Рудкоўскага. Агульначалавечыя праблемы ў творчасці: сёння і заўтра, дабро і зло, краса, сутнасць чалавечага жыцця ("Пісьмо на зямлю каханай...", "Роднаму краю" і інш.).

**Творчасць Яўгеніі Янішчыц** (1948–1988). Трагічны лёс паэткі. Кнігі "Снежныя грамніцы" (1970), "Дзень вечаровы" (1974), "Ясельда" (1978), "На беразе пляча" (1980), "Пара любові і жалю" (1983), "Каліна зімы" (1987), кніга выбранай лірыкі "У шуме жытняга святла" (1988). Вершы-прысвячэнні бацьку, маці, сыну ("Ля ложка хворай маці", "Бацькава музыка", "У калыханку сыну" і інш.). Адлюстраванне народнай трагедыі вайны ("Абеліскі", "Салдаткі", "У

бабулі Паланеі”). Інтымная лірыка паэткі (“Ты пакліч мяне. Пазаві”). Асэнсаванне праблем беларускай вёскі (паэмы “Зорная паэма”, “Ягадны хутар”). Я. Янішчыц – лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Купалы.

**Творчасць Ніны Мацяш** (1943–2009). Вытокі паэтычнага таленту Н. Мацяш. Адметнасць індывідуальнага светаўспрымання. Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя А. Куляшова. Аўтар паэтычных кніг: “Агонь” (1970), “Удзячнасць” (1973), “Ралля суровая” (1976), “Прыручэнне вясны” (1979), “Поўны келіх” (1982), “Жнівень” (1985), “Паварот на лета” (1986), “Шчаслівай долю назаві” (1990), “Паміж усмешкай і слязой” (1993), “Палёт над жытам” (1998), “Душою з небам гаварыць” (1999). Мудрая філасофская разважлівасць, назіральнасць, дасціпнасць, веданне сусветнай культуры і свайго нацыянальнага багацця, народных вытокаў. Творы для дзяцей. Пастаноўка Брэсцкім абласным тэатрам лялек п’ес “Прыгоды трох парасят”, “Крок у бессмяротнасць”. Перакладчыцкая дзейнасць Н. Мацяш – з польскай, нямецкай, французскай, украінскай моў. Творчасць В. Шымборскай, Э. Эрб, А. Сент-Экзюперы, Л. Кастэнкі ва ўзнаўленні перакладчыцы. Збрнікі “Перабіраю самацветы… Выбраныя пераклады з еўрапейскай паэзіі” (2002), “У прыгаршчах ветру : вершы, пераклады, эсэ” (2009).

## ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ
## **Літаратура Берасцейшчыны**

1. Раскажыце пра слаўныя літаратурныя традыцыі на берасцейскай зямлі (А. Філіповіч, браты Зізаніі, Я. Колас, інш.). Назавіце даследчыкаў літаратуры Берасцейшчыны і найбольш вядомыя выданні, якія прадстаўляюць літаратуру краю.

2. Акрэсліце ролю У. Калесніка ў развіцці берасцейскай літаратуры, згуртаванні пісьменнікаў, утварэнні літаб’яднання “Берасцейскае вогнішча”.

3. Сярод пісьменнікаў Берасцейшчыны назавіце прадстаўнікоў розных творчых пакаленняў і вядомыя вам пісьменніцкія гняздоўі.

4. Для выяўлення жанравай разнастайнасці літаратуры Берасцейшчыны і шырыні яе тэматычнага дыяпазону прааналізуйце паэтычныя, празаічныя і драматургічныя творы пісьменнікаў краю.

4.1 Зрабіце мастацка-праблемны аналіз прачытаных вамі твораў празаікаў-берасцейцаў (А. Наварыч, Г. Марчук, У. Глушакоў, Я. Пархута, З. Дудзюк, інш.).

4.2 Прэзентуйце паэтычныя галасы Берасцейшчыны (М. Рудкоўскі, М. Купрэеў, М. Пракаповіч, А. Каско, Л. Дранько-Майсюк, інш.). Чым узбагаціў беларускую і сусветную літаратуру наш зямляк А. Разанаў? Знайдзіце творы, якія сведчаць пра жанравую разнастайнасць берасцейскай паэзіі (трыялет, санет, рубаі, танка, інш.). Вызначце месца жаночай паэзіі

(Н. Мацяш, Я. Янішчыц, Р. Баравікова, З. Дудзюк, інш.) у літаратуры краю і нацыянальнай літаратуры.

4.3 Паразважайце пра ролю берасцейскіх драматургаў (М. Арахоўскі, Г. Марчук, Р. Баравікова, І. Сідарук, інш.) у развіцці сучаснай драматургіі.

5. Раскажыце пра найбольш вядомых берасцейскіх пісьменнікаў-перакладчыкаў (Н. Мацяш, В. Жуковіч, М. Рудкоўскі, інш.). Хто з іх і для чаго перакладчыцкай дзейнасці аддаваў столькі ж высілкаў, як і ўласнай творчасці?

6. Назавіце пісьменнікаў Берасцейшчыны, якія працуюць у розных родах літаратуры.

7. Падрыхтуйце рэферат на тэму "Пісьменнікі – мае землякі".

8. Акрэсліце праблемна-тэматычны і жанрава-стылёвы дыяпазон берасцейскай літаратуры.

9. Паразважайце: берасцейская літаратура – гэта адна з правінцыйных літаратур ці значная частка нацыянальнай і нават сусветнай літаратуры?

***У школьную праграму ўваходзяць наступныя творы пісьменнікаў Берасцейшчыны:*** казкі Г. Марчук "Чужое багацце" (5 кл.); урывак з "Аповесці чатырох падарожжаў", "Гальштучнік" Р. Баравіковай (6 кл.); "Казкі астранаўта" Р. Баравіковай (7 кл.); навелы "Канон Богу", "Канон Базару", "Канон Гарыні", "Канон Маці", раман "Крык на хутары" Г. Марчука, вершы Я. Янішчыц "Чаму ніколі не баюся я…", "Не воблака, а проста аблачынка…", "Помню, помню праз гады…", "Любоў мая…" (верш на памяць) (11 кл.).

